КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 11 (233) ◂ 18 сакавіка ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**СВОЙ СЯРОД ЧУЖЫХ, ЧУЖЫ СЯРОД СВАІХ...**

Стар. 5

**ДЫЯЛОГ**

У стратэгій апазіцыі, як правіла, невялікі часавы гарызонт. Зазіраць далей за чарговую выбарчую кампанію ў нас не прынята

Стар. 4

**МЯНЯЕМ ЁД НА КУРЫЛЫ**

Расія спрабуе выкарыстаць падзеі ў Японіі, каб перафарматаваць адносіны з Токіа ў пазітыўны бок і канчаткова вырашыць «пытанне Курылаў»

Стар. 12

**МЕЛОДЫІ АЛЕСЯ КАМОЦКАГА**

Стар. 14

ISSN 2218-2144

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ЯКАЎ БАСІН**

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Трэці сектар у асобах»

▸ З НАГОДЫ




# МЫТНЯ НА ТРАІХ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Днямі ў Мінску адбылося пасяджэнне Міждзяржаўнага савета ЕўрАзЭС, у якім прынялі ўдзел прэм'ер-міністр Казахстана Таір Мансураў, прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін і іх беларускі калега Міхаіл Мясніковіч. Адначасова правялі нараду сябры Савета міністраў так званай Саюзнай дзяржавы. Акрамя таго, Пуцін сустрэўся з Лукашэнкам.**

Такая колькасць мерапрыемстваў на маленькай пляцоўцы ў абмежаваныя тэрміны сведчыць пра пільную патрэбу абмеркаваць нейкія гарачыя праблемы ў іх звязку з паслявыбарнай беларускай рэальнасцю. Як заявіў Уладзімір Пуцін, гандлёва-эканамічныя адносіны паміж Расіяй і Беларуссю паспяхова развіваюцца, а Лукашэнка застаецца паслядоўным прыхільнікам інтэграцыі на постсавецкай прасторы.

Хітом напачатку новага палітычнага цыкла Лукашэнкі пастараліся зрабіць адзіную эканамічную прастору (АЭП) і Мытны саюз Расіі, Казахстана і Беларусі, дзякуючы якім ствараюцца дадатковыя магчымасці росту эканомік краін і падвышэння іх канкурэнтаздольнасці.

Калі бачыш такое аднадушша, так і хочацца крыкнуць — брава! Але, памятаючы пра цесны звяз паміж каштоўнасцямі і барацьбой за інтарэсы, жаданне радавацца знікае. Ніколі не трэба верыць тым, хто абяцае ўсяго многа, па таннай цане, а то і задарма.

Прыкладам, была калісьці самая вялікая ў свеце адзіная эканамічная прастора пад назвай СССР. На ёй розных рэсурсаў было незлічона. Як некалі казалі ў школе, уся табліца Мендзялеева! Прычым не ўсяго па троху, а ўсяго вельмі многа. Эканоміка СССР лічылася самадастатковай. Працуй сабе, падвышай прадукцыйнасць да неабмежаваных вяршыняў камунізму.

У выніку атрымалася Верхняя Вольта з ракетамі — самая неэфектыўная эканоміка з усіх вялікіх і ўжо нават сярэдніх краін. Прыкладам, у 1950-я гады савецкая эканоміка была значна мацнейшай за японскую, а ў 1990-х — слабейшай за паўднёвакарэйскую. І не толькі.

А дабра было... Прыкладам, у 1965 годзе еўрапейскім сацкраінам перагналі па сімвалічных коштах (увогуле, па бартэру) 8 мільёнаў тон нафты, у 1975 годзе — 50 мільёнаў, напачатку 1980-х гадоў агульны памер нафтавых паставак дасягнуў 508 мільёнаў тон. Адзначым, што на гэтыя гады прыпадае знакаміты энергетычны крызіс, дзякуючы якому сусветныя кошты на нафту ў некалькі разоў павысіліся.

Увогуле, усім, хто браў танныя савецкія рэсурсы, урэшце давялося плаціць вельмі вялікую цану. Фактычна, эканомікі ўсіх сацыялістычных краін збанкрутавалі, як і эканомікі ўсіх саюзных рэспублік СССР. Канкурэнтаздольнасць эканомікі праяўляецца толькі ў параўнанні з іншымі. А ў гэтым сэнсе ніводнай з сацкраін, ніводнай з брацкіх рэспублік пахваліцца не было чым.

Усеагульнае жаданне спажываць эканамічныя даброты пры цалкам размытай працоўнай матывацыі прывяло СССР да абсалютнай страты канкурэнтаздольнасці.

Дваццаць гадоў з таго часу мінула, многа перамен адбылося. Расія пазбавілася большай часткі сваёй неэфектыўнай прамысловасці, зменшыла ўнутранае спажыванне рэсурсаў і, дзякуючы кан'юнктуры, падвысіла канкурэнтаздольнасць коштам іх маштабнага экспарту. Казахстан мае на продаж і сыравіну, і энерганосьбіты, і хлеб. Ён таксама падвысіў сваю канкурэнтаздольнасць. А Беларусь, наадварот, страціла па ўсіх паказчыках. Яе прамысловасць, некалі адносна развітая, не атрымала далейшага развіцця. Яна імпартуе неабходныя для вытворчасці рэсурсы па цане прадаўца, а прадае па цане пакупніка. Прычым пакупніком выступаюць адны і тыя ж асобы — вытворцы рэсурсаў з Расіі і Казахстана. У структуры гандлю Беларусь амаль не мае пазіцый, па якіх мелася б дадатнае сальда ў гандлі з іншымі краінамі.

Словы Пуціна пра паспяховыя чыннікі ў нашых адносінах — гэта натуральны здзек. З беларускіх журналістаў і прэзідэнта. У студзені Пуцін зрабіў з ім усё, што хацеў. Па-першае, зацягнуў перамовы аб параметрах паставак нафты, і беларускія нафтаперапрацоўшчыкі працавалі напаўсілы. Таму экспарт скараціўся на 13,1%. А экспарт у «далёкае замежжа» ўвогуле склаў меней 60% ад памеру студзеня 2010 года. Наадварот, імпарт адтуль, мяркую, дзякуючы пастаўкам венесуэльскай нафты, павысіўся ў 2 разы.

У выніку ў студзені 2011 года Беларусь атрымала адмоўнае сальда ў памеры 903 мільёна долараў і ў 344 (!) разы перавысіла адмоўнае сальда студзеня 2010 года. На мове рэпрэсіўнай педагогікі гэта гучыць так: «Знайсці вінаватых і паказальна пакараць». Як, прыкладам, Тузіка, які, не дачакаўшыся прагулкі, зрабіў патрэбу на гаспадынін дыванок. З іншага боку, і правільна. Пасябраваў з Чавесам, дык не выстаўляй яго дуляй пад нос людзям аўтарытэтным.

З гэтага пункту гледжання так яно і ёсць, мытны саюз трох склаўся, і склаўся ўдала. Для дваіх — Расіі і Казахстана, якія маюць аднатыпныя эканомікі, гэта значыць магчымасці і патрэбу ў інтэграцыі. Для нас жа Казахстан застаецца тэра інкогніта, ад існавання або неіснавання якой амаль нічога ў беларускіх рэаліях не залежыць. Прыкладам, за студзень Беларусь прадала тавараў Казахстану на 26,9 мільёна долараў і купіла на 14,1 мільёна долараў. Для не вельмі вялікай фірмы ці прыватнай асобы грошы вялізныя, для краіны — драбязя. Як не пніся, не разбагацееш, але і значных страт не атрымаеш.

Іншая справа — Расія. У студзені яна так «нахіліла» Лукашэнку, што ён ужо стаў на калені. І таму паабяцала крэдыты. А ў нагрузку навязала АЭС, каб загрузіць расійскіх атамшчыкаў, якія пасля падзей у Японіі рызыкуюць увогуле застацца без заказчыкаў.

Як той казаў, куды фіга, туды і дым.

ХРОНІКА

# АД ПЕРАТРУСАЎ ДА ПАГРОМАЎ

Таццяна ШЭЛЕГ

**Вобшукі ў рэчыцкіх актывістаў правялі 15 сакавіка супрацоўнікі КДБ. Разгромлена грамадская прыёмная, дзеператрус адбыўся без гаспадароў.**

Прыёмная знаходзіцца па вуліцы Чапаева ў Рэчыцы ў прыватным доме. Мясцовыя актывісты аказваюць людзям юрыдычную дапамогу. Валер Пуціцкі, кіраўнік Гомельскай абласной арганізацыі Партыі БНФ, паведаміў, што дзверы памяшкання ўзламалі. Замкі ў дзвярах былі выламаныя «па жывому», відаць, манціроўкай, і забіты звонку цвікамі. У гаражы перакушана дужка замка — там таксама палазілі. Зніклі сістэмны блок кампутара, ноўтбук і прынтар.

Аргтэхніку канфіскавалі і ў сябра БНФ Алега Карбалевіча з вёскі Перасвятое. Супрацоўнікі Гомельскага ўпраўлення КДБ забралі сістэмны блок кампутара і рызограф, а таксама праваабарончую літаратуру.Ператрус у доме праводзілі трое чэкістаў пад кіраўніцтвам капітана Коласава. Ён адбываўся ў межах крымінальнай справы аб «масавых беспарадках» 19 снежня.

Чатыры гадзіны дапытвалі 15 сакавіка ў Магілёўскім абласным упраўленні КДБ актывістку Крысціну Шацікаву. Супрацоўнікі вайсковай контрвыведкі назваліся Паўлам Траўвулькам і Максімам Мешчараковым. Іх цікавілі фотаздымкі, якія актывістка зрабіла на плошчы падчас акцыі 19 снежня, і асобы, якія білі шкло ў дзвярах Дома ўрада. Як паведаміла актывістка, яна бачыла тых людзей. «І гэта былі не дэманстранты», — заявіла Крысціна Шацікава.

А ў Мінску маладафронтаўца Юльяна Місюкевіча на сёмы допыт завезлі на «Мерседэсе». Яго забралі 12 сакавіка з заняткаў ва ўніверсітэце: уручылі позву і павезлі ў КДБ. І гэта ўжо трэці раз, калі хлопца забіраюць з заняткаў. Прычым раней, як кажа Юльян, адвозілі на допыты на «Волгах». «А тут сказалі, што выходныя, субота, таму «Мерседэс», — распавёў ён Радыё «Свабода».

Актывіста зноў распытвалі пра падзеі 19 снежня. Па крымінальнай справе аб «беспарадках» ён праходзіць як сведка. На большасць пытанняў ён не адказваў, спасылаючыся на артыкул 27 Канстытуцыі (права не сведчыць супраць сябе і блізкіх). Юльян вучыцца на фізіка ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. «Шкада, што лабараторныя прапусціў — амаль ноч рыхтаваўся», — зазначыў хлопец.

Чатыры навагардскія актывісты — Уладзімір Качагур, Сяргей Вaўчок, Юры Казак і Дар'я Бахар — былі дапытаны ў КДБ у Мінску. Найбольш пытанняў ім задавалі пра маладафронтаўцаў Алеся Кіркевіча, Уладзіміра Яроменку і Насту Палажанку, якія з'яўляюцца абвінавачанымі па «справе 19 снежня».

На другім допыце 15 сакавіка пабываў і баранавіцкі актывіст Яраслаў Грышчэня. Яго таксама выклікалі гэтым разам не мясцовыя, а сталічныя чэкісты. І цікавіліся лідарамі «Маладога фронту» і дзейнасцю самога Яраслава ў гэтай арганізацыі. Камітэтчыкі дапытвалі яго больш за 4 гадзіны.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ПЕРАД СУДАМІ — ПАГРОЗЫ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Суд над лідарам «Маладога фронту» Зміцерам Дашкевічам і яго паплечнікам Эдуардам Лобавым адбудзецца 22 сакавіка, удзельніка акцыі 19 снежня Мікіту Ліхавіда будуць судзіць у той жа дзень.**



Зміцер Дашкевіч



Эдуард Лобаў



Мікіта Ліхавід

Працэс над маладафронтаўцамі прызначаны ў судзе Маскоўскага раёна Мінска. Іх абвінавачваюць у «асабліва злосным хуліганстве» (арт. 339 ч.3 КК). Хлопцаў затрымалі за дзень да прэзідэнцкіх выбараў — 18 снежня. Па версіі міліцыі, яны «з хуліганскіх пабуджэнняў беспрычынна і наўмысна, кулакамі і металічным цвікадзёрам збілі двух грамадзян» на вуліцы. Зміцер Дашкевіч і Эдуард Лобаў заяўляюць аб правакацыі ўладаў і ад пачатку не прызнаюць сваёй віны.

З жодзінскага ізалятара 2 сакавіка іх перавялі ў мінскі СІЗА №1 (Валадарку). Там, як стала вядома праваабаронцам «Вясны», Дашкевіча наведаў прадстаўнік вайсковай контрвыведкі. За адмову «супрацоўнічаць» ён пагразіў максімальным тэрмінам зняволення, які актывіст атрымае ў судзе і «цалкам правядзе ў карцэры». Як зазначылі праваабаронцы, нягледзячы на завершанасць следства па справе і блізкасць суда, ціск на хлопцаў па-ранейшаму працягваецца.

Дагэтуль у жодзінскім ізалятары фізічнай расправай пагражалі Эдуарду Лобаву, які адмовіўся даваць паказанні супраць «Маладога фронту». Да яго наведаліся два супрацоўнікі, адзін з якіх назваўся аператыўнікам КДБ.

У лісце Зміцер Дашкевіч напісаў, што ўтрымліваецца на Валадарцы ў вельмі перанаселеных умовах. І часам нават няма дзе прысесці. Актывістам пагражае пазбаўленне волі ад 3 да 10 гадоў. «Абяцалі мне мінімум пяцёрку», — паведамляў раней Дашкевіч.

Яго паплечніца Наста Палажанка звярнулася з адкрытым лістом да суддзі Алены Шылько, якая будзе судзіць актывістаў. Дзяўчына, нагадаем, два месяцы правяла ў СІЗА КДБ і з'яўляецца абвінавачанай па «справе 19 снежня». «Я чалавек, што даўно расчараваны ў судовай сістэме РБ і не маю ніякіх ілюзій адносна прыняцця рашэнняў суддзямі. Але ў сваю чаргу, як верніца, хачу вас папярэдзіць — за ўсё гэта будзе судзіць Гасподзь», — зазначыла Наста.

Працэс над 20-гадовым актывістам руху «За свабоду» Мікітам Ліхавідам прызначаны ў судзе Партызанскага раёна. Справу будзе разглядаць суддзя Наталля Пыкіна. Хлопец абвінавачаны ва ўдзеле 19 снежня ў «масавых беспарадках» (арт. 293 ч. 2 КК). З жодзінскага СІЗА актывіста таксама перавезлі на Валадарку. У яго камеры на 4 ложкі — 6 чалавек. Перад судом, падчас спаткання з маці, Мікіта сказаў, што добра разумее, да чаго такіх, як ён, рыхтуюць. «Ніколі не думала, што ён у мяне такі моцны», — сказала Алена Ліхавід.

«Мне балюча, але мой сын усё зрабіў правільна і паве́ў сябе як сапраўдны мужчына. Папрасіла, каб больш да мяне не звярталіся з такімі прапановамі», — паведаміла Алена Ліхавід.

P.S.: *Напярэдадні суду над Дашкевічам і Лобавым МФ звярнуўся да еўрадэпутатаў з просьбай надаць асаблівую ўвагу судам над палітвязнямі. Адмысловы зварот быў накіраваны да 800 прадстаўнікоў еўрапейскага парламенту. «Калі ў роднай краіне творыцца беззаконне і адсутнічае незалежная судовая сістэма, мы вымушаны, на жаль, звяртацца да замежных палітыкаў, каб прыцягнуць увагу і беларусаў, і замежнікаў да праблемы масавых рэпрэсій, што адбываюцца ў краіне,» — пракаментаваў намеснік старшыні МФ Мікалай Дземідзенка.*

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# ДЗЕЦЯМ ДАПАМОГУЦЬ

Таццяна ШЭЛЕГ

**Маладыя дэмакраты пачалі ў Мінску збор ахвяраванняў для дзяцей з малазабяспечаных сем'яў і сіротаў. Дабрачынную кампанію «Дапамажы дзецям!» яны хочуць распаўсюдзіць перш за ўсё на рэгіёны.**

Гэта ідэя ўзнікла ў моладзі яшчэ падчас прэзідэнцкай кампаніі. Паводле словаў актывістаў, тое, што яны пабачылі ў дзіцячых дамах, іх шакавала. Там нестае элементарнага, аж да паперы для прыбіральні. Таму яны і вырашылі арганізаваць гэту кампанію.

«Мы прыязджалі ў рэгіёны і часта бачылі, у якім стане жывуць дзеці ў мясцовых інтэрнатах, — паведаміў актывіст «Маладых дэмакратаў» Юры Лаўрэнцьеў. — У некаторых установах, бывае, нават не хапае паперы і сродкаў гігіены».

Вітаецца розная дапамога — рэчы, кнігі, цацкі, грашовыя ахвяраванні. Усё гэта будзе перадавацца ў дзіцячыя дамы і маламаёмным сем'ям, якія пакутуюць ад недахопу сродкаў. «Канешне, аказаць усім і паўсюль дапамогу нам не па сілам. Мы разумеем гэта. Але ўжо сёння мы пачынаем з малага», — адзначыў Юры Лаўрэнцьеў.

Акрамя перадачы падарункаў актывісты хочуць ладзіць сустрэчы з дзецьмі. І прывозіць з сабой цікавых гасцей, напрыклад, музыкаў. «І тут няма палітыкі, таму мы разлічваем на добрае стаўленне з боку кіраўніцтва інтэрнатаў, мясцовай улады і КДБ», — сказаў кіраўнік «Маладых дэмакратаў» Алег Корбан.

Першыя паездкі плануюцца ўжо праз два тыдні — у Стаўбцоўскі і Нясвіжскі раёны. Моладзь разлічвае, што дапамогу дзецям змогуць аказаць і іншыя прадстаўнікі дэмакратычных арганізацый, і проста неабыякавыя людзі.

P.S. Збор ахвяраванняў ладзіцца ў офісе Аб'яднанай грамадзянскай партыі. У любы працоўны дзень туды можна завітаць і пакінуць любыя рэчы і іншыя ахвяраванні. Па адрасе: вул. В. Харужай, 22—1701, тэл. (17) 289 50 09.

ФЕСТЫВАЛЬ

# МОЎНЫ РУХАВІК РЭКЛАМЫ

Вольга ХВОІН

**Беларускай рэкламы не бачна, але яна ёсць — прыкладна такімі словамі можна ахарактарызаваць стан беларускамоўнай рэкламы, для якой ужо другі год запар ладзіцца адмысловы фэст «ADNAK!».**

Фестываль беларускамоўнай рэкламы і камунікацыі «ADNAK!» распачаў прыём працаў. Конкурсная праграма фестывалю 2011 года будзе значна пашыраная за кошт новых тэм і кірункаў, якія існуюць на камунікацыйнай прасторы Беларусі.

Галоўная адметнасць другога фестывалю: разам са звычайнай рэкламай і PR значная ўвага надаецца працам, скіраваным на прасоўванне розных культурніцкіх праектаў, якія былі створаныя і прасоўваліся да аўдыторыі маркетынгавымі інструментамі і шляхамі. Такім чынам, апроч рэкламы і прамоцыі, у фестывалі возьмуць удзел іншыя камунікатыўныя праекты, напрыклад, фотапленэры, выставы, выдавецкія, кіна-, відэа-, тэатральныя пастановы і іншыя культурніцкія і грамадскія праекты.

Прадстаўнік інтэрнэт-парталу Marketing.by і адзін з арганізатараў фестывалю Сяргей Скараход, паводле сваіх назіранняў, верыць у перспектыву пашырэння сферу ўжытку беларускай мовы. «Магу адзначыць тэндэнцыю, што людзі ва ўзросце 40–50 гадоў бяруць падручнікі і пачынаюць вучыць мову. Для кожнага свае прычыны, гэта не ёсць заслуга фестывалю, але сам факт, што людзі пачалі разумець, што мова — гэта не калгас, а носьбіт культуры і камунікацыі. І за гэтым працэсам рэклама будзе ісці», — зазначае арганізатар фэсту беларускамоўнай рэкламы.

У шэрагу арганізатараў «ADNAK!» і кампанія «Будзьма беларусамі!», як каардынатарка Ніна Шыдлоўская мяркуе, што ўжыванне беларукай мовы ў рэкламе грае на карысць рэкламадаўцаў. «На сённяшні дзень у Беларусі няшмат беларускамоўнай рэкламы, беларускаарыентаванай, што само па сабе прыцягвае ўвагу спажыўцоў. А ўлічваючы тое, што кампанія «Будзьма беларусамі!» моцна апякуецца тым, каб беларуская мова максімальна ўваходзіла ва ўсе сферы ўжытку нашага грамадства, мы зацікаўленыя ў тым, каб рэклама як адзін з самых хуткіх і штодзённых фактараў, якія ўплываюць на свядомасць і падсвядомасць людзей, таксама станавілася беларускамоўнай. Вельмі важная для нас і якасць той рэкламы, але той фактар, што беларускамоўная рэклама сама па сабе выбіваецца з агульнага шэрагу, на маю думку, для вытворцаў рэкламы мусіць быць стымулам, каб рабіць рэкламу па-беларуску», — гаворыць Шыдлоўская.

Збор працаў будзе весціся з 15 сакавіка па 6 чэрвеня. Асноўны фестывальны дзень пройдзе 23 чэрвеня. Цягам гэтага дня будуць ладзіцца майстар-класы вядучых беларускіх рэкламістаў, круглыя сталы і сустрэчы з удзелам прафесійных гульцоў рэкламнага і камунікатыўнага рынкаў Рэспублікі Беларусь. Фіналам стане ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў фестывалю 2011 года.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# АБДУРВАННЕ ДЫ ІНШЫЯ ДЗІВОСЫ

Генадзь КЕСНЕР

**Яўленне расійскага прэм'ера Уладзіміра Пуціна беларускаму грамадству, дакладней, уладнай яго частцы, з абяцаннямі шматмільярдных у доларавым вымярэнні выгод сталася, бадай, галоўнай падзеяй апошніх дзён. Калі, канешне, не лічыць імкненне шырокіх народных мас канвертаваць айчынныя грашовыя знакі ў больш надзейныя плацежныя сродкі.**



Кіраўнік расійскага ўраду, відаць, прымусіў панервавацца сяго-таго ў вышэйшым беларускім кіраўніцтве, калі ажно на паўтары гадзіны спазніўся прыбыць у Мінск «з працоўным візітам» 15 сакавіка дзеля ўдзелу ў пасяджэнні Саўміна «Саюзнай дзяржавы» Беларусі і Расіі, а таксама ў сустрэчы прэм'ер-міністраў краін-удзельніц Мытнага саюза (Беларусі, Расіі ды Казахстану). Справа ў тым, што ёсць досвед «кідалава» ў апошні момант ініцыяваных кіраўніцтвам РФ вядомых інтэграцыйных праектаў з боку некаторых высокапастаўленых службовых асобаў, з-за якіх, напрыклад, у свой час узнікалі праблемы з падпісаннем дакументаў па стварэнні Калектыўных сілаў аператыўнага рэагавання Арганізацыі Дамовы аб калектыўнай бяспецы. Дык хто ж мог даваць гарантыі, што і Пуціну ў апошні момант штосьці не стрэльне ў галаву? Але гэтым разам абышлося.

Аляксандр Лукашэнка гутарыў са сваім былым расійскім візаві замест планаваных сарака хвілінаў ажно дзве гадзіны. І гэта зразумела. Як сказаў за некалькі дзён да гэтага візіту кіраўнік Аналітычнага цэнтру «Стратэгія» Леанід Заіка, «Лукашэнка і Мясніковіч будуць клянчыць у Пуціна грошы». І для такога меркавання эканаміста былі істотныя падставы, бо золатавалютныя рэзервы краіны за першыя два месяцы бягучага года скараціліся больш як на мільярд амерыканскіх доляраў, а хуткіх крыніц паступлення баксаў ды іншых там еўра ў золатавалютныя рэзервы неяк не праглядалася.

Пасля сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам Уладзімір Пуцін як пра вырашанае пытанне заявіў пра зліццё Мінскага аўтамабільнага заводу з КАМАЗам. Вось толькі цікава, як гэта суадносіцца са зробленымі 19 лютага заявамі, што ўсе размовы пра аб'яднанне гэтых дзвюх прадпрыемстваў ёсць «чыстай вады інсінуацыяй і ўкідам», а ў Беларусі «нават не падступалі да гэтых пытанняў»?

Таксама было афіцыйна паведамлена пра падпісанне расійска-беларускага міждзяржаўнага пагаднення аб будаўніцтве ў Беларусі атамнай электрастанцыі расійскай дзяржкарпарацыяй «Росатам». Тут зноў пытанні: Пуцін казаў, што існуе магчымасць (!) падпісання з Беларуссю крэдытнага пагаднення на 6 мільярдаў долараў на будаўніцтва атамнай станцыі. Але ж беларускія ўлады раней казалі пра 9 мільярдаў «зялёных». Праўда, расійскі прэм'ер агаварыўся, што можна дыскутаваць і магчымасць крэдытавання інфраструктуры АЭС, на што спатрэбіцца яшчэ тры мільярды долараў. Калі і хто гэта дыскутуе — не ўдакладняецца.

Дарэчы, Уладзімір Пуцін з усім сваім красамоўствам выдаў на гара, што «Беларусь абдурыла Расію ў частцы паставак прадукцыі». Як высветлілася, кіраўнік расійскага ўраду меў на ўвазе прыведзены ім жа факт, што расійскі экспарт у Беларусь вырас летась на 8%, а вось беларускі ў Расію — на 46%. Нават з гакам. Чамусьці толькі Пуцін забыўся ўзгадаць, што пры такім «абдурыла» адмоўнае сальда для Беларусі ў гандлі з Расіяй склала 8242,1 мільёна долараў. Някепска, так?

Зноў жа Пуцін заявіў, што Расія бязмытава паставіць у Беларусь у 2011 годзе 21,6 мільёна тон нафты, і такім чынам эканоміка Беларусі будзе прасубсідавана на 4,3 мільярда долараў толькі за гэты год. А чаму расійскі прэм'ер не кажа пра так званыя прэміі расійскім нафтавым кампаніям, якія за кожную тону пастаўлянай у Беларусь нафты атрымліваюць ад нас прэмію — каля 45 долараў? Хіба гэта не схаваная экспартная пошліна? Закіды з боку беларускага кіраўніцтва аб прадстаўленні крэдытаў у памеры 3 мільярдаў долараў пакінем у баку, бо гэта асобная тэма для размовы.

> Уладзімір Пуцін з усім сваім красамоўствам выдаў на гара, што «Беларусь абдурыла Расію ў частцы паставак прадукцыі». Ён меў на ўвазе, што расійскі экспарт у Беларусь вырас на 8%, а беларускі ў Расію — на 46%

Дарэчы, прэм'ер-міністру Расіі быў перададзены ліст сваякоў фігурантаў крымінальнай справы аб так званых «масавых беспарадках» 19 снежня 2010 года. 14 сакавіка сябры ініцыятывы «Вызваленне» перадалі ў расійскае пасольства ліст да Пуціна, у якім заклікалі яго «распачаць рэальныя крокі, каб паспрыяць вызваленню беларускіх вязняў сумлення». «Сённяўвесь свет, у тым ліку і Расія, асудзілі палітычнае свавольства і прававое бязмежжа, што ладзяцца беларускімі ўладамі, — гаварылася ў звароце сябраў ініцыятывы да расійскага прэм'ера. — 15 сакавіка вы маеце намер наведаць Мінск. У межах гэтага візіту не выключаная ваша сустрэча з Аляксандрам Лукашэнкам. Як палітычнага лідара вялікай краіны, мы заклікаем вас распачаць рэальныя крокі, каб паспрыяць вызваленню беларускіх вязняў сумлення. Сёння не толькі мы, іхнія змучаныя сваякі, але і ўвесь свет з надзеяй глядзіць на вас як на чалавека, які можа спыніць зладжаную Лукашэнкам расправу над палітычнымі супернікамі і прымусіць яго паважаць элементарныя правы чалавека».

Як лічаць сваякі зняволеных палітыкаў, Пуцін можа ўмяшацца ў сітуацыю з мэтай «выратаваць жыцці людзей і пацвердзіць, што Расія — гэта сапраўды сяброўская нам дзяржава, якая не можа заставацца ў баку, калі ў Беларусі пануе свавольства і беззаконне».

Гледзячы па ўсім, ці то Пуцін не чытаў гэты ліст, ці то ён быў запозна перададзены кіраўніку расійскага ўраду, але відочнай рэакцыі на зварот пакуль не заўважна. Як мяркуе палітычны аглядальнік Раман Якаўлеўскі, Пуціна найперш хвалююць не лёсы людзей, а расійскія крэдыты ды прыбыльныя праекты.

А тым часам просты абывацель зноў штурмуе абменнікі. І хоць Нацбанк абвяргае ўсе чуткі пра магчымую аднамоментную дэвальвацыю, электарат больш схільны верыць уласнай інтуіцыі, таму і заўважныя апошнімі днямі чэргі для акенцаў абменных пунктаў з тых, хто хоча набыць еўрыкі ці баксікі. Толькі не ўсім шанцуе, таму можна пажадаць грамадзянам, прагным да еўра-амерыканскіх разліковых білетаў, удачы ў справе хоць неяк забяспечыць сваю фінансавую будучыню.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### ПЁТР ПРАКАПОВІЧ

Па краіне ўжо не першы тыдзень блукае прывід эканамічных праблем — з'яўляюцца плёткі пра магчымую дэвальвацыю, валюту з абменнікаў размятаюць на раз, ёсць абмежаванні ў правядзенні валютных аперацый. На фоне гэтых непрыемных падзей і чутак старшыня Нацбанка Беларусі Пётр Пракаповіч імкнецца выглядаць анёлам-дабравеснікам.

«Мы ўжо другі год гаворым, што няма ніякай неабходнасці скупляць валюту. Курс стабільны і будзе заставацца стабільным у межах устаноўленага калідора плюс-мінус 8 працэнтаў да кошыка валют», — сказаў ён. Пры гэтым кіраўнік Нацбанка падкрэсліў, што для таго, каб змяніць калідор, неабходны ўказ прэзідэнта. Пракаповіч перакананы, што ў гэтым годзе такі ўказ не з'явіцца. «Тым больш, што мы не выкарыстоўвалі існуючы калідор», — цытуе старшыню Нацбанка БелаПАН. Пракаповіч зазначыў, што «ў дачыненні да дэвальвацыі заўсёды ёсць спецыяльныя людзі, якія распаўсюджваюць чуткі, каб у Беларусі было дрэнна». «Гэта самы добры спосаб усіх узбудзіць, стварыць паніку, каб усе беглі ў банкі і скуплялі валюту», — сказаў кіраўнік Нацбанка.

Адказваючы на пытанне аб рэакцыі Расіі на ўвядзенне ў Беларусі абмежаванняў на набыццё валюты для закупкі імпарту, Пракаповіч сказаў, што ніякіх прэтэнзій расійскі бок не меў. Хаця расійскі віцэ-прэм'ер Аляксей Кудрын заявіў, што валютныя абмежаванні за закупку імпарту звужаюць магчымасці беларускага бізнесу. «Па-сутнасці, кампаніі не могуць атрымаць на рынку неабходны аб'ём валюты для канвертацыі», — зазначыў чыноўнік. І сказаў, што такія абмежаванні не з'яўляюцца рынкавымі метадамі.



### АНАСТАСІЯ ВІННІКАВА

Прадстаўніца Беларусі на «Еўрабачанні–2011» Анастасія Віннікава выйдзе на сцэну пад нумарам 16 у другім паўфінале конкурсу ў Дзюсельдофе 2 мая. Беларуская дэлегацыя перадала арганізатарам конкурсу поўны пакет дакументаў, неабходны для ўдзелу: запіс песні Анастасіі Віннікавай, кліп і інфармацыю аб выканаўцы. Да сустрэчы кіраўніцкоў дэлегацый быў напісаны новы варыянт конкурснай песні пад назвай "Я люблю Беларусь". Аўтарства новай кампазіцыі, як і другога варыянту "Я беларуска", належыць Яўгену Алейніку і Святлане Гераськовай, перадае БелаПАН. Кліп беларускай удзельніцы размешчаны на афіцыйным сайце конкурсу.

Раней фокус-група ў складзе прадстаўнікоў найбуйнейшых тэлеканалаў абвясціла пераможца нацыянальнага адборачнага тура — Насцю Віньнікаву з песняй «Born in Bielorussia» («Народжаная ў Беларусі»), музыку да якой напісаў Яўген Алейнік, словы — Яўген Алейнік і Віктар Рудэнка. Але пасля негатыўнай рэакцыі і шквалу крытыкі песню замянілі.

У мінулым годзе на «Еўрабачанні» ў Осла Беларусь прадстаўляў гурт «3+2». Ён выйшла ў фінал конкурсу, дзе заняў перадапошняе месца. Лепшы вынік на «Еўрабачанні» паказаў у 2007 годзе Дзмітрый Калдун, які заняў шостае месца ў фінале.



### АЛЕГ КАЧАН

Міністр спорту і турызму Алег Качан агучыў амбіцыйныя мэты алімпійскай зборнай Беларусі — заваяваць на Алімпійскіх гульнях у Лондане не менш за 25 медалёў, з якіх 5 — залатых.

«Кіраўніком дзяржавы, кіраўніком Алімпійскага камітэта пастаўленыя вельмі сур'ёзныя задачы. Мы павінны пераадолець мяжу ў 25 медалёў на Алімпіядзе ў Лондане, з якіх 5 — залатых, і наблізіцца альбо ўвайсці ў дзясятку мацнейшых спартыўных краін свету. У апошніх двух алімпійскіх цыклах мы замацаваліся ў дваццатцы мацнейшых краінаў. На зімовых Алімпійскіх гульнях у Сочы мы павінны заваяваць не менш за 5 медалёў», — заявіў Качан. Да Алімпійскіх гульняў у Лондане рыхтуюцца 275 кандыдатаў у 31 відзе спорту. Алег Качан зацверджаны ў якасці шэфа беларускай місіі на Алімпіядзе ў Лондане.

Ужо ў якасці шэфа місіі Алег Качан хутка адправіцца ў Сочы на сустрэчу кіраўнікоў спартыўных міністэрстваў і нацыянальных алімпійскіх камітэтаў краін СНД, Балтыі і Усходняй Еўропы. У жніўні, за год да пачатку Алімпіяды, прыме ўдзел у нарадзе шэфаў місій у Лондане.

XXX летнія Алімпійскія гульні пройдуць у Лондане 27 ліпеня —12 жніўня 2012 года.

▸ АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ДЫЯЛОГ

## СТРАТЭГІЧНЫЯ ПЛАНЫ НА НАЙБЛІЖЭЙШУЮ БУДУЧЫНЮ




Сяргей НІКАЛЮК

**У стратэгій апазіцыі, як правіла, невялікі часавы гарызонт. Зазіраць далей за чарговую выбарчую кампанію ў нас не прынята.**

У вясновым паветры адчуваецца стратэгічны прысмак. Сакавік. Пасля «крывавай нядзелі» прайшло тры месяцы. Пошук чарговай пераможнай стратэгіі зноў апынуўся ў цэнтры ўвагі апазіцыі. Іншых стратэгій мы будаваць не ўмеем. Як любіў паўтараць старшыня Мао: *«Если делать, то по-большому»*. Да такой паважнай справы падштурхоўваюць і чарговыя выбары. Гэтым разам парламенцкія. Яны адбудуцца ў 2012 годзе.

Выбары — гэта наша ўсё! Яны з'яўляюцца важным фактарам, што кансалідуе расколатае беларускае грамадства. «Большасць» (прыхільнікі ўлады) галасуе, па-першае, таму што прызвычаілася, па-другое, таму што прызвычаілася, па-трэцяе, таму што прызвычаілася. А ёсць жа яшчэ па-чацвёртае, па-пятае... А чаму галасуе «меншасць»? Ды па тых жа прычынах.

Сучаснага беларуса можна разглядаць як чалавека, які галасуе. Іншай палітычнай актыўнасці, акрамя электаральнай, ён не ведае. Але калі «большасць» галасуе і верыць у вынікі галасавання, дык «меншасць» галасуе і не верыць (глядзі табліцу). Вось такая сіла звычкі, якую беларусы, нібы бурлакі на Волзе, цягнуць за сабой з савецкага мінулага.

### Няма грамадзян — няма грамадства

Пазбаўленне ад кепскай звычкі — справа клапотная. Без прафесійнай дапамогі з боку «меншасці» не абысціся. Праблема, аднак, палягае ў тым, што нашы прафесіяналы ў гэтым пытанні ад «меншасці» нічым не адрозніваюцца.

Яны, зразумела, чытаюць перад сном сур'ёзныя кнігі, выдадзеныя на Захадзе, але ў гэтых кнігах словы «палітыка» і «выбары» з'яўляюцца сінонімамі. Тут самы час раскрыць слоўнік. Для палітыкі патрэбны поліс (грэч. πολις — горад) — адмысловая форма сацыяльна-эканамічнай і палітычнай арганізацыі грамадства, тыповая для Старажытнай Грэцыі і для сучаснага заходняга свету.

Звярніце ўвагу, поліс — гэта не проста месца, дзе скучана жывуць людзі, гэта адмысловая форма арганізацыі грамадства. Вось з гэтай адмысловай формай у нас папросту бяда, і ўсё таму, што адмысловая форма патрабуе адмысловага напаўнення ў выглядзе грамадзян.

Няма грамадзян — няма грамадства. Няма грамадства — няма палітыкі як віду дзейнасці па ўзгадненні інтарэсаў грамадзян. Але прызнанне гэтай азбукавай ісціны, прычым не ў агульнатэарэтычным сэнсе, а ў яе пэўным беларускім увасабленні, патрабуе мужнасці. Пакуль ні ўлада, якая прадстаўляе «большасць», ні партыйная апазіцыя, якая перакананая, што яна адлюстроўвае інтарэсы «меншасці», у імкненні праявіць гэта заўважаныя не былі. Адсюль «вясёлыя» выбары. Гэта калі ўлада цягне сваіх спарынг-партнёраў за вушы, а ахвочыя даручыць уладзе свае вушы стаяць у чарзе.

У такіх умовах прыдумаць сабе занятак, які збоку ўспрымаўся б у якасці палітычнай дзейнасці, не так проста. Але не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло. Уся справа ў тым, што «збоку» — азначае «з Захаду». А тамтэйшыя палітычныя суб'екты, якія прымаюць рашэнне пра падтрымку сваіх беларускіх «калегаў», не здагадваюцца пра праблемы, апісаныя вышэй. Яны і ўявіць сабе не могуць, што ў геаграфічным цэнтры Еўропы поліс як адмысловая форма арганізацыі грамадства яшчэ не склаўся.

### Закон захавання палітычнай суб'ектнасці

Успрыманне апазіцыі ў якасці палітычнага суб'екта спараджае запатрабаванасць адпаведных стратэгій. «Сярод іх, — падагульняе Андрэй Ягораў, — можна вылучыць дзве: «рэвалюцыя» і «дыялог». Кожная з іх акцэнтуе ўвагу на розных спосабах трансфармацыі існага рэжыму».

З прычыны абмежаванага аб'ёму «Азбукі паліталогіі» я спынюся на дыялогу. Для яго эфектыўнага правядзення істотнымі з'яўляюцца два моманты: па-першае, пытанне «хто?», па-другое, «пра што?». Адказ на першае з іх упіраецца ў адсутнасць палітычных суб'ектаў. Зноў звярнуся па дапамогу да Ягорава: «Дыялог мае на ўвазе прызнанне бакамі адзін аднаго як паўнапраўных і паўнамоцных у вядзенні перамоваў».

Хто б сумняваўся! Я адразу ўяўляю сабе правадыра сусветнага пралетарыяту, які закідвае з Жэневы канцылярыю Яго Вялікасці лістамі з патрабаваннем прызнаць бальшавікоў паўнапраўным і паўнамоцным бокам дыялогу наконт будучыні Расійскай Імперыі. Бюракраты з канцылярыі, натуральна, упіраюцца, але ў абагульненага Леніна/Ягорава ў рукаве прыхаваны джокер. Мяркуеце самі: «Пераход ад аўтарытарызму да дэмакратыі адбываецца празаднаўленне палітыкі ў краіне».

Але тут я ўздымаю руку і прашу даць мне магчымасць задаць пытанне: «Што трэба разумець пад аднаўленнем палітыкі?» Яна што, калісьці была, а потым кудысьці падзелася? Мне запярэчаць: а як жа «ліхія 90-я»? Добрае пытанне... Паспрабую на яго адказаць.

Пачну з самага пачатку. Там, дзе няма грамадства, няма і палітыкі ў заходнім сэнсе. А што там ёсць? Там ёсць «вертыкаль» улады з «адзіным палітыкам» на яе вяршыні. Толькі ён валодае палітычнай суб'ектнасцю, г. зн. мае права на ўласныя інтарэсы. Яго галоўны інтарэс палягае... у захаванні манаполіі на палітычную суб'ектнасць. У выніку атрымліваецца замкнёны круг — кола, які коціцца па гісторыі ўжо некалькі сотняў гадоў.

За гэты час знешні антураж змяняўся неаднаразова. На змену імператарам прыйшлі генеральныя сакратары, тых, у сваю чаргу, пацясніў прэзідэнт, але на прынцыпе арганізацыі Улады гэта ніякім чынам не адбілася. Мы маем усё тую ж канструкцыю, якая складаецца з «адзінага палітыка», «вертыкалі» ўлады і апалітычнага грамадства.

Гэта канструкцыя валодае ўласцівасцю перыядычна абвальвацца і руйнавацца (у мінулым стагоддзі — двойчы). І вось тады грамадства прачынаецца і пераходзіць ва ўзбуджаны стан. Яно нібыта знаходзіць уласную палітычную суб'ектнасць у адказ на страту суб'ектнасці ўладай. Спрацоўвае своеасаблівы закон захавання палітычнай суб'ектнасці, і прэтэндэнты на ролю правадыроў вяртаюцца са Швейцарыі. З якім багажом яны гэта робяць — істотнае пытанне. Галоўнае — не апынуцца ў становішчы кадэтаў. Цытую па ўспамінах іх лідара Паўла Мілюкова: «Калі з'явіліся ў нашых ворагаў словы, што зачаравалі масы: мір, зямля, права на працу, класавая барацьба, то нам не было чаго ім супрацьпаставіць».

### Кансенсус! Кансенсус! Агу!

Удзел «адзінага палітыка» ў дыялогу, калі ўмовы для вяртання са Швейцарыі яшчэ не склаліся, значыў бы не толькі яго адмову ад улады, але і дэмантаж усёй «палітычнай» канструкцыі. Таму прапаную ад пытання «хто?» перайсці да пытання «пра што?». Здавалася б, пры адсутнасці палітычных суб'ектаў такі пераход пазбаўлены сэнсу, але не забывайце, што ў нас у запасе маецца «большасць» і «меншасць». Складовыя часткі расколатага беларускага грамадства самім фактам свайго існавання заклікаюць да пошуку нацыянальнага кансенсусу.

Аднак перш чым адгукнуцца на іх покліч, прапаную задумацца пра прыроду расколу. Па не зразумелых мне прычынах, гэта паліталагічная дробязь застаецца па-за полем зроку экспертнай супольнасці. У выніку гучаць прапановы па лячэнні хворага без папярэдняй пастановы дыягназу.

Між тым, у самім факце расколу беларускага грамадства нічога ўнікальнага няма. У свой час усе заходнія грамадствы прайшлі праз яго. Раскол — пабочны прадукт мадэрнізацыі. Насельніцтва не ў стане адначасова пазбавіцца ад традыцыйных каштоўнасцяў і асвоіць каштоўнасці мадэрну. Поліс і ў Старажытнай Грэцыі не адразу склаўся. Гэта — не падзея, гэта — расцягнуты ў часе працэс. Але нідзе і ніколі ён не ажыццяўляўся за кошт кансенсусу. Які можа быць кансенсус паміж новым і старым, паміж мінулым і будучым? Новае павінна назапашваць сілы і прарываецца наперад, а не займацца ўзгадненнем сваіх уяўленняў пра будучыню з тымі, хто не жадае расставацца з сучаснасцю, якая не адрозніваецца ад мінулага.

Аснову беларускай «большасці» складаюць прадстаўнікі перыферыйных сацыяльных груп (старыя, з нізкім узроўнем адукацыі, і тыя, хто пражывае ў сельскай мясцовасці). Выжыць у сучасных умовах без апекі з боку дзяржавы яны не ў стане. У «меншасці» процілеглыя сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі. Яе прадстаўнікі здольныя самастойна выбудоўваць і рэалізоўваць персанальныя жыццёвыя стратэгіі. Але для гэтага ім неабходная прынцыпова іншая дзяржава. Пра што тут можна дамаўляцца?

Трагедыя Беларусі палягае ў тым, што ўлада, якая склалася пад уплывам усходняга суседа, свой гістарычны рэсурс цалкам вычарпала. На рынках эканомік, дзяржаў і нацый мы не канкурэнтаздольныя. Улада гэта разумее, але выбар магчымых варыянтаў дзеяння ў яе абмежаваны. Іх два. Першы — дрэнны, другі — вельмі дрэнны.

Першы варыянт — гэта захаванне апоры на «большасць». Паслядоўная рэалізацыя гэтага плану запатрабуе ізаляцыі, як, напрыклад Паўночная Карэя, што немагчыма ў прынцыпе. Супраць такога курсу даволі хутка настроіцца і сама «большасць». Ёй жа абяцаны еўрапейскі ўзровень жыцця, і яна ўжо ў нецярпенні стукае лыжкамі па стале.

Другі варыянт прадугледжвае прадстаўленне «меншасці» магчымасці для самарэалізацыі. Дырэктыва №4 — прыклад руху цела ўлады ў гэтым накірунку. Для яе рэалізацыі ў лютым быў падпісаны ўказ пра абвяшчэнне 2011-га Годам прадпрымальнасці. Сімвалічна, што 150 гадоў таму Аляксандр II выдаў Маніфест пра адмену прыгоннага права. Цар-вызваліцель спадзяваўся пакласці канец самаўпраўству *«отяготительному для крестьян и неблагоприятному для их благосостояния, чему в крестьянах отвечала неподвижность к улучшениям в собственном быте»*. Вынікам вызвалення ад «неподвижности» стала ліквідацыя сялянамі прадстаўнікоў уладнай «вертыкалі» (як класа), а заадно і яе кіраўніка. Аднак папярэднічаў ліквідацыі распад дзяржаўнасці. Тут важна не пераблытаць прычыну са следствам.

Не выключана, што чарговы распад не за гарамі. Чым ён завершыцца? Шмат у чым тое будзе залежаць ад узроўню згуртаванасці «меншасці». На «меншасці» і варта засяродзіць свае высілкі апазіцыі. Але гэта ўжо тэма для наступнай «Азбукі паліталогіі».

**ЯК ВЫ ЛІЧЫЦЕ, ЦІ БЫЛІ ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ СВАБОДНЫМІ І СПРАВЯДЛІВЫМІ?», %**

| Варыянт адказу | 12'10 | Давяраюць Лукашэнку | Не давяраюць Лукашэнку |
|---|---|---|---|
| Так | 54 | 83 | 12 |
| Не | 32 | 8 | 74 |
| Цяжка адказаць / няма адказу | 13 | 8 | 14 |

Па выніках апытання НІСЭПД

КРУГЛЫ СТОЛ

# НЕЎМІРУЧАСЦЬ ІДЭАЛАЎ

Вольга ХВОІН

**На змену фрустрацыі ў беларускай палітыцы паступова прыходзіць дзеянне, але выглядае яно трохі ірацыянальным. Застаюцца размовы пра выбары — цяпер ужо парламенцкія — хаця выбараў няма, пра дыялог з уладай, хаця намеру сядаць за стол перамоў, абмяркоўваць з апазіцыйным лагерам наяўны стан рэчаў рэжым, відавочна, не мае.**



І ўсё ж у дзеянні ёсць сэнс. Прынамсі яно выцясняе з палітычнага поля пах адчаю і наканаванасці. Круглы стол «Напярэдадні новага палітычнага сезона» з удзелам палітычных аналітыкаў, кіраўнікоў арганізацый трэцяга сектару паказаў, што жыццё засталося. Але, калі гаварыць словамі палітолага Уладзіміра Мацкевіча, «у Беларусі многа маленькіх атрадзікаў, якія ў выпадку чаго кідаюць адзін аднаго і пераходзяць на бок гледачоў». Адзінства ідэй і поглядаў на тое, якой мусіць быць стратэгія дзеянняў апазіцыі, няма.

## «Змагацца да апошняга»

Палітолаг Алесь Лагвінец бачыць заканамернасць і ў імітацыі дэмакратызацыі да выбараў, і ў адкаце назад пасля — характэрная цыклічнасць беларускай палітыкі: паслабленні і «халодны душ».

«У 2006 і 2010 гадах частым словам у лексіконе палітыкаў была «Плошча». Мелі месца эйфарычныя настроі наконт таго, што Плошча будзе месцам, дзе вызначыцца, хто галоўны ў апазіцыі, стане мерай папулярнасці апазіцыйных сілаў, а таксама прымусіць рэжым да перамоў ці сыходу, — зазначае палітолаг. — Але колькасна ў палітычнай кампаніі 2010 года людзей больш не стала. Засталася нізкая мабілізаванасць да назірання. Рэакцыя на прапаганду рэжыму ці тых, хто падтрымлівае Лукашэнку, не была дастаткова актыўна-негатыўнай, грамадства не стварала сацыяльнага ціску, каб прыхільнікі Лукашэнкі саромеліся гэтага. Нават патэнцыйна дэмакратычна скіраванае грамадства актыўна зрэагавала толькі ў адзін дзень — 19 снежня, зладзіўшы так званы «парад сярэдняга класу». Выйшлі людзі, якія кіраваліся сваімі каштоўнасцямі, а не эканамічным чыннікам, але ночы рэпрэсій хапіла, каб зацяснуць гэтую актыўнасць».

Алесь Лагвінец канстатуе, што «ўдар па дэмакратычных сілах быў вельмі моцным», і прычына гэтага ў тым, што «сённяшняму кіраўніку трэба даказаць, што ён вераемны і будзе змагацца да апошняга, што ёсць мяжа, якую ён не дасць пераступіць, пакуль кантралюе сітуацыю».

Палітолаг бачыць тры варыянты развіцця падзей. Азербайджанскі — дыктатар перадасць уладу свайму пераемніку, апазіцыя будзе існаваць на ўзроўні дысідэнтаў, а грамадства знаходзіцца ў расцярушаным стане. Аўтарытарны рэжым у той ці іншай форме застаецца. Румынскі — адбудзецца непрагназаваны пратэст пад ціскам эканамічных фактараў, да ўлады прыйдуць прадстаўнікі наменклатуры, што атрымаюць падтрымку ў суседніх сталіцах. З часам гэта можа прывесці да дэмакратычных зменаў. Польскі варыянт — палітычныя сілы яднаюцца, каб салідарна выставіць свае патрабаванні рэжыму.

«Рэжым не мае шырокай падтрымкі, але і апазіцыя таксама, — канстатуе палітолаг Алесь Лагвінец. — Маем вотум недаверу да эканамічнай палітыкі, але ёсць і вотум недаверу да дэмакратычных сілаў. Я не ведаю прыкладаў страйкаў у салідарнасць з палітвязнямі на прадпрыемствах, ва ўніверсітэтах».

## Стратэгія–2012

Аналітык партала Wider Europe Вячаслаў Пазняк не з'яўляецца прыхільнікам радыкальных сцэнараў дзеяння.

«Перспектывы радыкальных пераменаў для асноўнай масы насельніцтва не абяцаюць нічога добрага. Думаю, многія чулі меркаванне, што Беларусі не патрэбная люстрацыя, не патрэбная непрафесійная новая вертыкаль. Адпаведна, народ чакае найперш сацыяльнай стабільнасці, — разважае Пазняк. — Не думаю, што правільна было б ставіць задачу звяржэння ўлады перад даволі аморфнай часткай грамадства, прапанаваць ёй узяць на сябе функцыі, што традыцыйна выконваюць палітычныя партыі. Трэба забяспечыць захаванне таго, што накапілася, набіраць салідарнасці і глядзець у кірунку, што арганізацыі могуць зрабіць, каб на парламенцкіх выбарах да ўлады прыйшлі прагрэсіўна думаючыя людзі».

Прыход «прагрэсіўна думаючых людзей» плануецца восенню 2012 года, калі мусяць адбыцца парламенцкія выбары, аднак выпускаецца з поля зроку той факт, што допускаць у калідоры ўлады нават адзінкі такіх людзей няма ў планах рэжыму Лукашэнкі. Што прымусіць змяніць кірункі афіцыйнай палітыкі — не зразумела.

Дырэктар Цэнтра еўрапейскіх трансфармацый палітолаг Андрэй Ягораў прадставіў «Стратэгію–2012: ад дыялогу ўнутры дэмакратычных сілаў да дыялогу з рэжымам». Праграма, трэба прызнаць, прапісаная няблага, але зноў-такі не зразумела, якія «дывізіі» прымусяць улады выканаць прапанаваную апазіцыяй стратэгію. Што слушнае — тэза аб тым, што апазіцыі трэба аб'яднацца вакол нейкай адной ідэі. І падчас дыялогу з уладамі дамагчыся правядзення свабодных і дэмакратычных парламенцкіх выбараў, на якіх апазіцыя мусіць заваяваць 15–20% месцаў у парламенце.

І тут да месца заўвага выдаўца Пятра Марцава: «А чаму вы мяркуеце, што яны (улады) сядуць размаўляць з вамі?» «Стратэгія добрая, і схема нядрэнная, але з людзьмі, якія шмат гадоў крытыкавалі Лукашэнку, ён за стол перамоваў не сядзе. Больш таго, палова з іх цяпер у турме. Чаму вы думаеце, што яны хутка выйдуць?» — задаваўся рытарычнымі пытаннямі Марцаў. Ён не бачыць канчатковай кропкі ў пабудове «кіруемай дэмакратыі», як і ў планах уладаў стварыць новую апазіцыю. «Жорсткая зачыстка палітычнага поля можа азначаць канчатковае «не» старой палітычнай апазіцыі. Улады могуць пачаць гарадзіць трохпартыйную ці аднапартыйную сістэму. Калі ўжо ёсць факт, што пратэстны электарат значна шырэйшы за апазіцыйны, значыць, трэба працаваць над аналізам ідэй, што могуць прыцягнуць людзей. І я б рэкамендаваў тэхналогію пошуку аднадумцаў і стварэння новай буйной палітычнай сілы. Ёсць вялікі рэсурс з тых, хто хоча дзеянняў і шукае прымянення сабе», — рэзюмаваў Марцаў.

Стратэгію дзеянняў апазіцыі планавалася абмеркаваць падчас прадстаўнічай канферэнцыі «Роля і месца грамадзянскай супольнасці ў стратэгіі будучыні», якая павінна была адбыцца 18–19 сакавіка. Аднак і Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтрам, адным з заснавальнікаў якога з'яўляецца Мінгарвыканкам, і гатэлем «Краўн Плаза» аргкамітэту было адмоўлена ў памяшканні. Канферэнцыю перанеслі на красавік.

УЦЯКАЧ

# СВОЙ СЯРОД ЧУЖЫХ, ЧУЖЫ СЯРОД СВАІХ...

Вольга ХВОІН

**Былы кандыдат на пасаду прэзідэнта Беларусі Алесь Міхалевіч у ноч на 14 сакавіка пакінуў Беларусь. Ён паведаміў, што знаходзіцца «не ў зоне дасягальнасці беларускага КДБ». Як стала вядома Беларускай службе Польскага радыё з неафіцыйных крыніц, Міхалевіч быў дастаўлены ў Польшчу на службовым аўтамабілі амбасады адной з цэнтральнаеўрапейскіх краін у Беларусі.**



Нагадаем, Алесь Міхалевіч быў вызвалены з турмы КДБ пад падпіску аб нявыездзе. Пасля выхаду на свабоду ён арганізаваў прэс-канферэнцыю, падчас якой заявіў, што ў зняволенні ён падвяргаўся катаванням. Акрамя таго, ён падпісаў дакумент аб супрацоўніцтве са спецслужбамі, што было ўмовай яго вызвалення.

Прызнанне Алеся Міхалевіча было ўспрынятае неадназначна. Абвінавачваюць і ў тым, што цяпер не выпусцяць астатніх вязняў, і што экс-кандыдат — «праект КДБ», і што ўвогуле слабы чалавек аказаўся. Як бы ні было насамрэч (а ўсю праўду пакуль мала хто ведае), але прызнанне Міхалевіча аб катаваннях у цэнтры Еўропы страсянула свядомасць еўрапейскіх палітыкаў, якім, відаць, нарэшце стала зразумела, што рэжым Лукашэнкі — імітацыя, але не рэжыму, а ліберальнасці і дэмакратыі.

10 сакавіка Еўрапейскі парламент ужо прыняў адпаведную рэзалюцыю. Еўрапарламент падвергнуў рэзкай крытыцы грубыя парушэнні правоў чалавека ў Беларусі, прымяненне катаванняў да апазіцыянераў і пануючую цяпер у краіне «атмасферу страху».

Сябры Еўрапейскага парламента заклікалі кампетэнтныя інстытуты ЕС і краін-партнёраў разгледзець пашырэнне абмежавальных мер супраць работнікаў пракуратуры, суддзяў і прадстаўнікоў КДБ, якія прымалі ўдзел у парушэннях правоў чалавека, у выпадку, калі рэпрэсіі не будуць спыненыя. Ад Мінска еўрапарламентарыі запатрабавалі без прамаруджання пачаць расследаванне паведамленняў аб прымяненні катаванняў да палітвязняў. Прымяненне катаванняў з'яўляецца бесчалавечныя абыходжаннем, катэгарычна забароненым нормамі міжнароднага права і абсалютна недапушчальным у еўрапейскай краіне. У дакуменце ўказваецца таксама на недапушчальнасць працягу запалохвання і прыгнёту апазіцыянераў і незалежных СМІ.

«Я не прэтэндаваў на тое, каб быць героем. Я не збіраўся піярыцца на сядзенні ў турме, дый увогуле сядзець не збіраўся. Хацеў пасля выбараў працаваць над прыцягненнем інвестыцый, — напісаў Міхалевіч у артыкуле для рэсурса naviny.by пасля свайго ад'езду. — Я хацеў застацца чалавекам і нікому не шкодзіць, займацца сям'ёй і зарабляць грошы, захаваўшы сумленне. Супраць мяне пачаліся апісаныя мной раней катаванні. Большасць кандыдатаў, якія, у адрозненне ад мяне, заклікалі на Плошчу на тэлебачанні, ужо былі дома. Каб выйсці з турмы, я напісаў ліст Лукашэнку, дзе наступіў на ўласныя амбіцыі. Сказаў, што вылучаўся, каб паказаць яму праблемы краіны з гледзішча простага чалавека. Я нікога не асуджаў, і Лукашэнку гэтага хапіла, а вось Камітэту дзяржаўнай бяспекі падалося мала. Мяне пачалі дэманстратыўна падазраваць у шпіянажы. Мне на практыцы паказалі, што «хлопцы ў масках» не спыняцца ні перад чым. Я пабачыў, што ламаюць не толькі мяне. Ламаюць краіну».

Дзе цяпер знаходзіцца Міхалевіч, невядома. Нават яго жонка Мілана, гаворыць, што не ведала пра планы мужа з'ехаць з краіны.

ЭКСПЕРТЫЗА

# КАРУПЦЫЯ ЯК ЧЫННІК ЯДЗЕРНАЙ БЯСПЕКІ

Генадзь КЕСНЕР

**Расійскія і беларускія эксперты, у тым ліку эколагі і фізікі-ядзершчыкі, крытычна ставяцца да магчымасці будаўніцтва ў Беларусі атамнай электрастанцыі. Пра гэта яны заявілі 14 сакавіка падчас прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да запланаванага на 15 сакавіка магчымага падпісання міжурадавага пагаднення паміж Беларуссю і Расіяй аб будаўніцтве беларускай АЭС.**

Мяркуецца, што, калі будзе падпісана такое пагадненне, то беларускую АЭС прафінансуе расійская дзяржава і фактычна цягам шасці гадоў пабудуе расійская дзяржаўная карпарацыя «Росатам». Пры гэтым этап праектавання і вынаходніцтваў будзе скарочаны да паўгода.

Па словах сустаршыні міжнароднай групы «Экаабарона» (Расія) Уладзіміра Слівяка, любыя ядзерныя пытанні зараз разглядаюцца ў кантэксце таго, што цяпер адбываецца ў Японіі. «Мы зараз бачым, наколькі небяспечная атамная энергетыка, мы бачым, што ніхто не застрахаваны ад чалавечых памылак, а ў атамнай прамысловасці гэта можа прыводзіць да вельмі цяжкіх наступстваў. На прыкладзе Японіі мы ўбачылі, што чалавек не можа кіраваць прыроднай стыхіяй, і ў такіх умовах развіваць атамную энергетыку — надзвычай небяспечная рэч».

Расійскі эксперт звярнуў увагу на чыннік карупцыі ў расійскай атамнай энергетыцы.

«Мы правялі шэраг даследаванняў, якія дазволілі высветліць, наколькі вялікі ўзровень карупцыі ў расійскай карпарацыі «Росатам», якая плануе будаваць беларускую АЭС. Насамрэч, пытанне карупцыі важнае не толькі ў эканамічным аспекце, яно вельмі важнае з пункту гледжання ядзернай бяспекі, — падкрэсліў Уладзімір Слівяк. — Мы ўзялі для аналізу такую сферу, як закупкі. Для праекта беларускай АЭС, калі ён усё ж будзе ажыццяўляцца, «Росатам» таксама будзе праводзіць шматлікія закупкі. Увогуле, трэба разумець, што тыя крэдытныя сродкі, якія плануе выдаткаваць Расія пад праект беларускай атамнай станцыі, не будуць пераведзеныя Мінску, яны будуць патрачаныя ўнутры Расіі на закупкі паслуг, абсталявання карпарацыяй «Росатам», якая потым даставіць усё гэта ў Беларусь. Мы прааналізавалі аналагічныя закупкі, выбралі для аналізу трыста закупак, адабралі з іх дзвесце найбольш складаных. З гэтых двухсот закупак, якія мы прааналізавалі, высветлілася, што прыкладна 41 працэнт замоваў праведзеныя з парушэннямі заканадаўства і нават унутраных нарматываў «Росатама».




«З нашага пункту гледжання, такі ўзровень у 41 працэнт парушэнняў падчас закупак сведчыць пра тое, што рызыка карупцыі пры размяшчэнні замоваў на паслугі і тавары «Росатамам» вельмі высокая, і гэта перакліжаецца з неафіцыйнымі заявамі саміх экспертаў — былых атамшчыкаў, што ўзровень «адкатаў» у расійскай атамнай прамысловасці складае 40 працэнтаў. Такі высокі ўзровень карупцыі будзе адбівацца на ўзроўні ядзернай бяспекі новых аб'ектаў у бок яе паніжэння», — падкрэслівае эксперт.

Як адзначыў кіраўнік энергетычнага аддзелу «Грынпіс» Расіі Уладзімір Чупроў, заявы пра эканамічную выгаду ад будоўлі АЭС у Беларусі не адпавядаюць рэчаіснасці. «Сабекошт будаўніцтва ў атамнай энергетыцы сёння расце значна хутчэй — прыкладна ў два разы — за сабекошт будаўніцтва ў іншых сектарах. Сцвярджэнні аб выгодах атамнай энергетыкі абвяргаюцца вынікамі мінулагодняга тэндэра ў Турцыі, дзе для аналагічнай атамнай станцыі «Росатам» заявіў сабекошт энергіі ў 21 цэнт за кілаватгадзіну. Гэта больш, чым дасць газавы сцэнарый для Беларусі нават пры росце кошту прыроднага газу пры пераходзе на камерцыйныя разлікі пры пакупцы прыроднага газу ў Расіі, — звяртае ўвагу эксперт. — Тэндэр быў пераглядзены, кошт быў зніжаны да 15 цэнтаў, але гэта яшчэ адзін доказ таго, што ніякай эканамічнай палёгкі для электраэнергетыкі Беларусі не будзе. Нас часта пыталіся: а што ўзамен? Мы ацанілі кошт энергіі і электрычнай энергіі для сцэнарыя, калі Беларусь развівае сваю ветравую і біяэнергетыку, бо сёння гэта дзве буйныя крыніцы, што могуць замясціць аналагічны аб'ём энергіі, які мяркуецца выраблядь атамнай генерацыяй. Кошт яе будзе прыкладна на 20% меншым. Тое, што зараз адбываецца ў Беларусі, — праграмы аднаўляемых крыніц энергіі, — гэта дакладна дэманструюць».

Па словах расійскага фізіка-ядзершчыка Андрэя Ажароўскага, дагэтуль невядомы дакладны кошт праекта будаўніцтва ў Беларусі АЭС. «Атрыманыя вынікі праведзеных даследаванняў сведчаць, што сёння ядзерная энергетыка эканамічна нежыццяздольная і не здольная развівацца на камерцыйнай аснове нават з дзяржаўнымі гарантыямі, якія здымаюць частку рынкавых рызыкаў», — лічыць Ажароўскі.

Адказны сакратар Камісіі грамадскай экалагічнай экспертызы беларускай АЭС Таццяна Новікава падкрэсліла, што праект будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Беларусі з'яўляецца непразрыстым.

«Тыя парушэнні, якія сёння зафіксаваныя камісіяй грамадскай экалагічнай экспертызы, тая непразрыстасць праекта, якая ёсць на сённяшні дзень, тыя парушэнні, якіяназіраюць грамадскія арганізацыі ў дзейнасці кампаніі «Росатам», дазваляюць нам сказаць наступнае: мы маем намер прымаць удзел у расследаванні карупцыйнага складніка, бо наяўнасць непразрыстасці стварае ўмовы для карупцыі, — перакавана Таццяна Новікава. — Умовы праекта пастаянна мяняюцца, інфармацыя не прадстаўляецца, сёння праект ажыццяўляецца з парушэннем устойлівых норм тэхнічнай практыкі. Тэрміны на праектаванне скарочаны да паўгода, хаця звычайна праектныя работы вядуцца два гады. Гэта выклікае ў нас вельмі сур'ёзную заклапочанасць, і мы ўжо звярнуліся да прэзідэнта Мядзведзева з просьбай не фінансаваць гэты праект і расследаваць яго».

Варта нагадаць, што астравецкая пляцоўка, дзе ўлады плануюць пабудаваць АЭС, знаходзіцца амаль на мяжы разлому зямной паверхні, які атрымаўся ў выніку землятрусу магнітудай 7 балаў на пачатку XX стагоддзя. Па словах экспертаў, ніякага дасканалага даследавання гэтай тэрыторыі профільнымі спецыялістамі не праводзілася.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЮ ЗРУЙНУЮЦЬ

Аляксей ХАДЫКА

**Гэтымі днямі Мінск маўкліва развітваецца з унікальным помнікам прамысловай архітэктуры — знаёмым усім жыхарам сталіцы будынкам першай гарадской электрастанцыі.**



Трансфарматарны і машынны карпусы, узведзеныя каля 1890 года паміж цыркам і галоўным мостам праз Свіслач, паўразбураныя варварскай разборкай, глядзяцца зараз маўклівымі сведкамі. Сведкамі нашай абыякавасці і брутальнай непавагі да закону.

Узведзеныя ў часы губернатарства графа Караля Гутэн-Чапскага, дзейсныя як электрастанцыя яшчэ пасля апошняй вайны ў часы адбудовы горада,ператвораныя затым у спартовыя памяшканні, муры маглі б стаць, напрыклад, каштоўным прытулкам для будучага музея гісторыі тэхнікі. Але не стануць. Трывога за іх лёс узнікла ў 2010 годзе, калі паводле ўказу прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 мая 2010 г. №243 «Аб умовах будаўніцтва шматфункцыянальнага комплексу ў г. Мінску» пачалося планаванне прылеглых да будынку цырка карпусоў з гатэлем «Кемпінскі» — проста на месцы размяшчэння электрастанцыі.

Праўда, забудоўшчыку — СТАА «Эліт-Эстэйт» — ніхто не прадпісваў знішчаць унесены ў склад Дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь пад шыфрам 713Г000183 гістарычны архітэктурны комплекс. Трэба было ўзгадніць генплан забудовы паміж Упраўленнем па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры (начальнік — Ігар Чарняўскі), Мінгарвыканкамам, праекціроўшчыкам і забудоўшчыкам.

Цягам 2010 года нарадзіліся два варыянты: першы — з пераносам (фактычна руйнаваннем і адбудовай макету бліжэй да праспекту) двух асноўных карпусоў электрастанцыі, і другі — з перасоўваннем гмаху гасцініцы бліжэй да Свіслачы. Перамог, зразумела, першы. На генплане ўжо стаяць подпісы пра яго ўзгадненне усіх бакоў. Гэта азначае, што закон, а таксама павага да гістарычнай спадчыны, чарговы раз праігнараваныя на карысць матэрыяльнай мэтазгоднасці. Будаўніцтва мусіць цалкам скончыцца ў 2014 годзе. Значыць, да гэтага часу мы ў лепшым выпадку ўбачым перанесены на некалькі дзясяткаў метраў макет былога помніка.

Кіраўнік Добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч у спробе выратаваць помнік звярнуўся з адкрытым лістом да міністра культуры Паўла Латушкі. А таксама склаў заяву ў Генеральную пракуратуру пра парушэнне заканадаўства па ахове помнікаў і бяздзеянне адказных устаноў, уключаючы міністэрства. Па стане на 16 сакавіка сітуацыя не абяцае ніякіх цудаў. Напярэдадні Генеральная пракуратура перадала справу ў гарадскую, хаця ўзровень справы адпавядае менавіта кампетэнцыі першай. А Міністэрства культуры захоўвае маўчанне.

Як напісаў 3 сакавіка ў сваім блогу вядомы журналіст Глеб Лабадзенка, які прыклаў нямала намаганняў для ўратавання электрастанцыі, звяртаючыся да адказных за ахову гістарычнай спадчыны чыноўнікаў: «Што вы абаранілі? Каго вы пакаралі? Колькасць знішчаных помнікаў толькі ў Мінску ідзе на дзясяткі, па краіне — на сотні. Колькасць выключаных са Спіса каштоўнасцяў — таксама. Вашым дзецям, герастраты, будзе сорамна, калі ім пакажуць фоткі і нагадаюць, што гэта іх бацькі вынішчылі Мінск, бо дужа любілі атрымліваць на кішэню…»

7

# TV ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 21 САКАВІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.05** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.05, 08.10, 18.50, 01.05** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** «Дзелавое жыццё».
**08.30** У свеце матораў.
**09.10** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**10.10** «Здароўе».
**10.35** «Культурныя людзі». Інфармацыйна-забаўляльная праграма.
**11.05** Серыял «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**12.10** Серыял «Вясковая камедыя» (Расія).
**14.15** Сінематэка.
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Nota Bene.
**16.30** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.25** Серыял «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**18.25** «Акно ў Еўропу».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.50** «Ход у адказ». Ток-шоў.
**21.00** «Панарама».
**21.45** «Камандзіроўка. Журналісцкае расследаванне».
**22.00** Серыял «Абдуры мяне-2» (ЗША).
**23.15** Паліцыянт дэтэктыў «Па-за часам» (ЗША).
**01.15** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адчынены фармат».
**22.10** «След».
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Васіль Сталін. Сын за бацьку».
**00.20** «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Начныя навіны.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М. Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Вар'яцкі лістапад 2». Расія.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** Фільм «Круты Джо». ЗША, 2001 г.

### лад

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.10** Фільм-фэнтэзі «Легенда» (ЗША-Вялікабрытанія).
**11.50** Пра мастацтва.
**12.20** Школа рамонту.
**13.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.20** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.20** Пазакласная гадзіна.
**15.35** Навіны надвор'я.
**16.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Музычная камедыя «Сабака на сене» (СССР). 1-я серыя.
**20.30** Калыханка.
**20.45** Тэлебарометр.
**20.50** Беларуская часіна.
**22.00** «Альбарутэнія».
**22.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.10** Авертайм.
**23.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**00.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Пакой смеху».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Тая, што стварыла цуд». Дакументальны фільм.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.35** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** Прэм'ера. «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.15** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.30** Тэлесерыял «Цуд».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** «Нічога асабістага».
**23.45** «Весткі.ru».
**00.05** Прэм'ера. «Гарадок».

### НТВ

**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.20** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.35** Серыял «Аўтобус».
**15.10** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Мент у законе».
**21.35** Прэм'ера. Серыял «Тэрмінал».
**23.45** «Сумленны панядзелак».
**00.35** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Лёгкая атлетыка. Марафон (Сеул, Паўднёвая Карэя).
**10.30** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Даніі. Жанчыны. Канада - Шатландыя. Прамая трансляцыя.
**11.30** Тэніс. Турнір WTA у ЗША. Фінал.
**13.00** Снукер. «Players Tour Championship» (Дублін). Фінал.
**15.10** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Даніі. Жанчыны. Германія - Шатландыя. Прамая трансляцыя.
**15.15** Біятлон. Кубак свету ў Нарвегіі (Халмелколен). Жанчыны. Мас-старт.
**16.00** Біятлон. Кубак свету ў Нарвегіі (Халмелколен). Мужчыны. Мас-старт.
**17.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.00** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**19.30, 01.15** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Славеніі (Планіца). HS 215.
**20.45** Вось дык так!!!
**21.50** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.00** Пра рэстлінг. «Vintage Collection». ЗША.
**22.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**23.30** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** «Заткніся і забі мяне» , маст. фільм, 2005 г., Вялікабрытанія–Чэхія.
**09.00, 13.35** Дак. гадзіна: «Ганна, сем год на лініі фронту», дак. фільм, 2008 г., Расія.
**10.20, 14.55** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**10.35, 15.10** ПраСвет.
**11.05** Эксперт.
**11.30, 15.50** Басанож па свеце.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Заткніся і забі мяне», маст. фільм, 2005 г., Вялікабрытанія–Чэхія.
**15.35** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.15** МакраФон: Міжнародны фестываль «Jazz Jamboree–1983»: «Майлз Дэйвіс».
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**17.35** «Час гонару», серыял: 21 серыя.
**18.20** Невядомая Беларусь: «Далёка нам яшчэ да БНР», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**18.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**18.55** «Генерал нясконачанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 2.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Еўропа сёння.
**20.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.30** «Каліф на гадзіну», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў.
**21.25** Сцяна, дак. цыкл.
**21.50** Фільматэка майстроў: «Дабранач», маст. фільм, 2007 г., ЗША–Вялікабрытанія.
**23.25** Сцяна, дак. цыкл.
**23.30** Аб'ектыў.
**23.50** Гарачы каментар.

## 22 САКАВІКА, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.55, 18.00, 19.00, 22.50** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 01.05** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**11.40** Камандзіроўка. Журналісцкае расследаванне.
**12.10** Камедыйны дэтэктыў «Старыя палкоўнікі» (Украіна-Расія).
**14.05** «Ход у адказ». Ток-шоў.
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Патрабуецца».
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў-2».
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Серыял «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў». Эканамічная праграма.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама».
**21.45** Серыял «Абдуры мяне-2» (ЗША).
**23.00** Прэм'ера. Меладрама «Хелен» ((ЗША-Вялікабрытанія-Германія).
**01.10** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.05** Прэм'ера. Шматсер. фільм «Адплата».
**22.20** «След».
**23.30** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.05** «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**00.55** Начныя навіны.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «Вар'яцкі лістапад 2». Расія, 2008 г.
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Халасцякі». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Хірамант 2». Серыял.
**23.55** «Водбліскі». Серыял.

### лад

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** «Альбарутэнія».
**08.35** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.35** Музычная камедыя «Сабака на сене» (СССР). 1-я серыя.
**11.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**12.45** Авертайм.
**13.15** «Страсці па культуры».
**13.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.55** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.50** Пазакласная гадзіна.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**17.00** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Музычная камедыя «Сабака на сене» (СССР). 2-я серыя.
**20.30** «Калыханка».
**20.45** Тэлебарометр.
**20.50** Беларуская часіна.
**22.00** «Альбарутэнія».
**22.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.10** «Спорт-кадр».
**23.40** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Ціхая вайна Васіля Пушкарова». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** «Кулагін і партнёры».
**12.15** Тэлесерыял «Цуд».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** Прэм'ера. «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.15** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Цуд».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Эфір як прадчуванне». Дакументальны фільм.

### НТВ

**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.20** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.25** «Кватэрнае пытанне».
**11.25** «Жаночы погляд».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Серыял «Аўтобус».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Мент у законе».
**21.35** Прэм'ера. Серыял «Тэрмінал».
**23.45** «Пакаранне. Руская турма ўчора і сёння».

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**11.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Даніі. Жанчыны. Швецыя - Данія. Прамая трансляцыя.
**13.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Славеніі (Планіца). HS 215.
**14.00** Біятлон. Кубак свету ў Нарвегіі (Халмелколен). Жанчыны. Мас-старт.
**14.45** Біятлон. Кубак свету ў Нарвегіі (Халмелколен). Мужчыны. Мас-старт.
**15.30** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Даніі. Жанчыны. Германія - Швецыя. Прамая трансляцыя.
**18.00** Снукер. «Players Tour Championship» (Дублін). Фінал.
**20.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Славеніі (Планіца). HS 215.
**21.00** Бокс. Super fights.
**22.00** Бокс.
**00.00** Экстрэмальны спорт. «Freeride Spirit». Часопіс.
**00.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету сярод легкавых аўтамабіляў. Часопіс.
**01.00** Мотаспорт. Агляд. Часопіс.
**01.20** Лёгкая атлетыка. Марафон (Сеул, Паўднёвая Карэя).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30, 12.05** «Гняздо», серыял: 9 серыя.
**08.20** «Час гонару», серыял: 21 серыя.
**09.10** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**09.40, 14.10** Еўропа сёння.
**10.05, 14.35** «Каліф на гадзіну», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**10.30, 15.00** Сцяна, дак. цыкл.
**10.40** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**11.00** «Генерал нясконачанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 2.
**11.30** Невядомая Беларусь: «Далёка нам яшчэ да БНР», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**11.50** Сцяна, дак. цыкл.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.55** «Час гонару», серыял: 21 серыя.
**13.40** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**15.10** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**15.30** «Генерал нясконачанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 2.
**16.00** «Рука цырульніка», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**16.50** Сцяна, дак. цыкл.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**17.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 29 серыя.
**18.30** ПраСвет.
**18.55** Два на два (тэледыскусія).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Праект «Будучыня».
**20.25** Навігатар.
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў.
**21.25** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** Сцяна, дак. цыкл.
**21.45** Рэпартэр.
**22.15** «Доктар Марцін», серыял: 29 серыя.
**23.00** Басанож па свеце.
**23.25** Сцяна, дак. цыкл.
**23.30** Аб'ектыў.
**23.50** Гарачы каментар.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 23 САКАВІКА, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.55, 18.00, 19.00, 22.50** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 01.00** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтэрасаў». Эканамічная праграма.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Зацьменне».
**11.40** Відэафільм АТН «Стоўбцы. Зямля песняра» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Меладрама «Птушка шчасця».
**14.05** «Акно ў Еўропу». Інфармацыйная праграма.
**14.30** «Эпоха».
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** «OFF STAGE LIFE».
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў-2».
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Серыял «Зацьменне».
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Серыял «Абдуры мяне-2» (ЗША).
**23.00** «Не кажы ні слова». Трылер (ЗША-Аўстралія).
**01.05** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял. Заключная серыя.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.05** Прэм'ера. Шматсер. фільм «Адплата».
**22.20** «След».
**23.30** Асяроддзе пасялення.
**00.30** «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**01.20** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінштына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Серыял.
**14.40** «Халасцякі». Серыял.
**15.30** «Хірамант 2». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Хірамант 2». Серыял.
**23.55** «Водблiскі». Серыял.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** «Альбарутэнія».
**08.35** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.45** Музычная камедыя «Сабака на сене» (СССР). 2-я серыя.
**12.00** Спорт-кадр.
**12.25** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**13.10** Медычныя таямніцы.
**13.45** Медычныя таямніцы +.
**13.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.55** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.45** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**17.50** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Фінал. Матч 1-ы. Прамая трансляцыя. У перапынку : Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** Беларуская часіна.
**22.30** «Альбарутэнія».
**23.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.40** Рэальны свет.
**00.15** Хакей. КХЛ. Плэй-офф. Фінал канферэнцыі «Захад». Матч 1-ы.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Я крочу па Маскве. Генадзь Шпалікаў». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Цуд».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** Прэм'ера. «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.15** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Цуд».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Бодэнскі капкан. Смерць над возерам». Дакументальны фільм.

### НТВ

**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.20** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Дачны адказ».
**11.15** «Развод па-руску».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Серыял «Аўтобус».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Мент у законе».
**21.35** Прэм'ера. Серыял «Тэрмінал».
**23.45** «Пакаранне. Руская турма ўчора і сёння».

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальны спорт. «Freeride Spirit». Часопіс.
**10.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Кароткая праграма. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**12.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Кароткая праграма. Пары. Прамая трансляцыя.
**15.55** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**16.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**18.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Даніі. Жанчыны. Швейцарыя - Канада. Прамая трансляцыя.
**20.00** Веласпорт. Трэк. Чэмпіянат свету (Каралеўства Нідэрландаў). Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**22.45** Вось дык так!!!
**22.55** Навіны коннага спорту.
**23.00** Гольф. ЗША. P.G.A. «Tour Transitios Championship».
**00.00** Гольф. Еўрапейскі тур (Сіцылія).
**00.30** Гольф-клуб.
**00.35** Яхт-клуб.
**00.45** Абранае па серадах.
**01.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны.
**02.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету сярод легкавых аўтамабіляў. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Зграя», сенсацыйны серыял.
**08.25, 12.55** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 29 серыя.
**09.15** «Пілі Доўгаяпанчоха», серыял.
**09.45, 14.15** Праект «Будучыня».
**10.10** Рэпартэр.
**10.40** Сцяна, дак. цыкл.
**10.45** Беларусы ў Польшчы.
**11.05** Два на два (тэледыскусія).
**11.35** Сальда (эканамічная праграма).
**11.50** Сцяна, дак. цыкл.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Зграя», сенсацыйны серыял.
**13.50** «Пілі Доўгаяпанчоха», серыял.
**14.45** Рэпартэр.
**15.15** Сцяна, дак. цыкл.
**15.20** Беларусы ў Польшчы.
**15.35** Два на два (тэледыскусія).
**16.05, 20.15** Навігатар.
**16.20** Сальда (эканамічная праграма).
**16.40** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.50** Сцяна, дак. цыкл.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Пілі Доўгаяпанчоха», серыял.
**17.35** «Доктар Марцін», серыял: 29 серыя.
**18.25** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**18.40** Эксперт.
**19.10** Асабісты капітал.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах.
**20.35** Вагон.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў.
**21.25** Маю права (прававаая праграма).
**21.45** Сцяна, дак. цыкл.
**21.50** Два на два (тэледыскусія).
**22.20** «Мой Нікіфар», маст. фільм, 2004 г. Польшча.
**00.00** Сцяна, дак. цыкл.
**00.05** Аб'ектыў.
**00.25** Гарачы каментар.

## 24 САКАВІКА, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.55, 18.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 01.35** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**12.10** Меладрама «Гульні дарослых дзяўчынак» (Расія-Украіна).
**14.30** «Эпоха».
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў-2».
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Серыял «Абдуры мяне-2» (ЗША).
**22.50** «Клуб рэдактараў».
**23.50** Трылер «Чацвёрты выгляд» (ЗША-Вялікабрытанія).
**01.40** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Крушэнне імперыі. Апошняя сталіца».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Шматсер. фільм «Адплата».
**22.20** «След».
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Сведкі».
**00.30** «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**01.20** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Халасцякі». Серыял. Закл. серыя.
**15.30** «Хірамант 2». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Хірамант 2». Серыял.
**23.55** «Водблiскі». Серыял.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** «Альбарутэнія».
**08.35** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.35** Дак.-пазнавальны фільм «Палінэзія. Паміж небам і вадой» (Францыя). 1-я серыя.
**11.40** Бітва экстрасэнсаў.
**12.40** Дача здароўя.
**13.10** Жансавет.
**13.40** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.40** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.40** Пазакласная гадзіна.
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.50** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**17.50** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Фінал. Матч 2-і. Прамая трансляцыя. У перапынку: «Калыханка».
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** Беларуская часіна.
**22.30** «Альбарутэнія».
**23.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.40** Час футболу.
**00.10** Хакей. КХЛ. Плэй-офф. Фінал канферэнцыі «Усход». Матч 1-ы.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Гітлер, Сталін і Гурджыеў». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Цуд».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** Прэм'ера. «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.15** «Гарадок». Дайджэст.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Цуд».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Паядынак».

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Баль на ўвесь свет».
**11.20** «Таямнічая Расія».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Серыял «Аўтобус».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Мент у законе».
**21.35** Прэм'ера. Серыял «Тэрмінал».
**23.20** Сёння.
**23.45** «Пакаранне. Руская турма ўчора і сёння».

### EUROSPORT

**09.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Адвольная праграма. Пары. Прамая трансляцыя.
**11.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Адвольная праграма. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**14.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Адвольная праграма. Пары.
**16.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Даніі. Жанчыны. Канада - Германія. Прамая трансляцыя.
**18.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Адвольная праграма. Мужчыны.
**19.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**20.00** Веласпорт. Трэк. Чэмпіянат свету (Каралеўства Нідэрландаў). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**23.00** Байцоўскі клуб. Каралеўскі кубак (Бангкок, Тайланд).
**01.15** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Адвольная праграма. Пары.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Мой Нікіфар», маст. фільм, 2004 г. Польшча.
**09.00** «Доктар Марцін», серыял: 29 серыя.
**09.45** «Пілі Доўгаяпанчоха», серыял.
**10.15** На колах.
**10.40** Госць «Белсату».
**10.55** Сцяна, дак. цыкл.
**11.00** Маю права (прававаая праграма).
**11.25** Эксперт.
**11.50** Сцяна, дак. цыкл.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Доктар Марцін», серыял: 29 серыя.
**12.50** «Ваенны фатограф», дак. фільм, 2001 г., Швейцарыя.
**13.40** «Пілі Доўгаяпанчоха», серыял.
**14.10** На колах.
**14.35** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**14.50** Госць «Белсату».
**15.10** Сцяна, дак. цыкл.
**15.15** Маю права (прававаая праграма).
**15.35** Эксперт.
**16.05** Навігатар.
**16.20** Два на два (тэледыскусія).
**16.50** Сцяна, дак. цыкл.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Школа на санцапёку», серыял.
**17.30** «Мой Нікіфар», маст. фільм, 2004 г. Польшча.
**19.00** «Дзень волі», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Праект «Будучыня».
**20.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.30** «Пішчалаўскі замак», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў.
**21.25** Рэпартэр.
**21.50** Сцяна, дак. цыкл.
**21.55** Форум (ток-шоў): «Патрыёты і касмапаліты».
**22.40** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 12 серыя.
**23.30** Сцяна, дак. цыкл.
**23.35** Аб'ектыў.
**00.00** Гарачы каментар.

## 25 САКАВІКА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.35** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**12.10** Меладрама «Садоўнік» (Украіна).
**13.45** «OFF STAGE LIFE».
**14.05** «Школа доктара Камароўскага». Ток-шоў (Украіна).
**14.30** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Патрабуецца.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў-2».
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.55** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Баявік «Параграф 78» (Расія).
**23.45** Дакументальны цыкл «Неразгаданая гісторыя» (ЗША).
**01.20** Дак. цыкл «Зброя будучыні» (ЗША).
**02.10** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Крушэнне імперыі. Змова генералаў».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Вясновая серыя гульняў.
**22.25** «Фабрыка зорак. Вяртанне».
**00.45** «Наша Белараша».
**01.20** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Ваенная таямніца».
**14.40** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**15.30** «Хірамант 2». Серыял.
**16.50** «Рэпарцёрская гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Круты татачка». Францыя, 2008 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.15** Фільм «Выспа страчаных душ». Германія - Данія - Швецыя, 2007 г.
**02.00** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** «Альбарутэнія».
**08.40** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.45** Дакументальна-пазнавальны фільм «Палінэзія. Паміж небам і вадой» (Францыя). 2-я серыя.
**11.45** Час футболу.
**12.15** «Лабірынты: невядомая Літва». Фільм першы.
**12.45** Кінаспробы.
**13.05** Жывы гук.
**13.50** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.55** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.20** Пазакласная гадзіна.
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Хакей. КХЛ. Плэй-офф. Фінал канферэнцыі «Захад». Матч 2-і. У перапынку: «Калыханка».
**21.25** Тэлебарометр.
**21.30** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.25** «Альбарутэнія».
**23.00** «Бітва экстрасэнсаў».
**00.10** «Пра мастацтва».
**00.40** Дыялогі аб рыбалцы.
**01.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Цуд».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** Прэм'ера. «3 новай хатай!». Ток-шоў.
**16.15** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.25** Фільм «Калі бракуе кахання».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** «Песні сапраўдных мужчын».

### НТВ

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Апошняе слова».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Вочная стаўка».
**12.05** «Да суду».
**13.35** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.05** Прэм'ера. Серыял «Тэрмінал».
**23.00** Прэм'ера. Крымінальная драма «Гульні д'ябла».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету сярод легкавых аўтамабіляў. Часопіс.
**10.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Кароткая праграма. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**14.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Танцы. Кароткая праграма.
**16.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету ў Даніі. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**18.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Кароткая праграма. Жанчыны.
**19.10** Футбол. Еўра-2012. Часопіс.
**19.30** Веласпорт. Трэк. Чэмпіянат свету (Каралеўства Нідэрландаў). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**23.00** Спаборніцтвы лесасекаў. Аўстрыя.
**23.30** Спаборніцтвы лесасекаў. Аўстрыя.
**00.00** Футбол. Еўра-2012. Абранае.
**00.45** Экстрэмальны спорт. «Freeride Spirit». Часопіс.
**01.15** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Кароткая праграма. Жанчыны.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Мой Нікіфар», маст. фільм, 2004 г. Польшча.
**09.00, 13.40** Праект «Будучыня».
**09.30** «Школа на санцапёку», серыял.
**09.55** Форум: «Патрыёты і касмапаліты».
**10.40, 15.30** Рэпартэр.
**11.05, 15.55** «Пішчалаўскі замак», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**11.30, 16.25** «Дзень волі», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Мой Нікіфар», маст. фільм, 2004 г. Польшча.
**14.05** «Школа на санцапёку», серыял.
**14.35** Форум: «Патрыёты і касмапаліты».
**15.20** Сцяна, дак. цыкл.
**16.50** Сцяна, дак. цыкл.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Таямніца Сагалі», серыял: 4 серыя.
**17.30** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**18.20** Форум: «Патрыёты і касмапаліты».
**19.05** Без рэтушы: «Вацлаў Іваноўскі», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах.
**20.15** «Бульбаны», мультсерыял.
**20.25** «Слуцкі збройны чын», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў.
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** Сцяна, дак. цыкл.
**21.45** Невядомая Беларусь: «Гульня ў вайнушку», 2009 г., Польшча.
**22.15** «Пітбуль», серыял: 4 серыя.
**23.00** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.10** Сцяна, дак. цыкл.
**23.15** Аб'ектыў.
**23.40** Гарачы каментар.

## 26 САКАВІКА, СУБОТА

**07.10** Мультфільмы.
**07.30** Існасць.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.15** «Школа доктара Камароўскага». Ток-шоў (Украіна).
**10.50** Камедыйны серыял «Сваты-3» (Украіна).
**12.10** Прыгодніцкі баявік «Піраты ХХ стагоддзя» (СССР).
**13.55** Хакей для ўсіх.
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Nota Bene.
**16.45** Дак. цыкл «Атлас «Дыскаверы» (ЗША).
**17.40** Відэафільм АТН «Ельскія гуканні» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «OFF STAGE LIFE».
**19.45** Камедыйны серыял «Вясковая камедыя» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.40** Фільм тыдня. Сямейная драма «Тэтра» (ЗША).
**00.10** «Чаму мужчыны ніколі не слухаюць, а жанчыны не ўмеюць паркавацца». Рамантычная камедыя (Германія).
**01.55** Дзень спорту.

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** «Смак жыцця».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** Фільм «Альпійская казка».
**15.00** Асяроддзе пасялення.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Камедыя «Глядзіце, хто загаварыў 3».
**18.00** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.50** АНТ прадстаўляе: «Я спяваю».
**20.30** Нашы навіны.
**20.55** Футбол. Адборачны матч чэмпіянату Еўропы. Албанія - Беларусь. Прамая трансляцыя.
**22.55** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.35** «Што? Дзе? Калі?».
**00.45** Фільм «Цудоўны».

**06.40** Фільм «Міхайла Ламаносаў. Ад нетраў сваіх». СССР, 1986 г. Закл. серыя.
**07.55** Фільм «Круты татачка». Францыя, 2008 г.
**09.35** «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.35** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.20** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.55** Фільм «Вяртанне «Святога Лукі». СССР, 1970 г.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Выпадковы запіс». Украіна, 2009 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Джон Ф. Кэнэдзі: стрэлы ў Даласе». ЗША - Францыя, 1991 г.
**01.20** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.00** Нашы тэсты.
**07.30** Усё аб бяспецы.
**07.55** Рэальны свет.
**08.30** Дыялогі аб рыбалцы.
**09.05** «Альбарутэнія».
**09.40** Жансавет.
**10.20** Дача здароўя.
**11.00** Тэлебарометр.
**11.05** «Ты і Я». Забаўляльнае ток-шоў (Расія).
**12.10** «Страсці па культуры».
**12.55** «Лабірынты: невядомая Літва». Фільм другі.
**13.25** Мастацка-публіцыстычны фільм «Загадкі дзеда Кандрата».
**13.55** Хакей. КХЛ. Плэй-офф. Фінал канферэнцыі «Усход». Матч 2-і. Прамая трансляцыя.
**16.25** Фільм-фэнтэзі «Загадка Сфінкса» (Канада).
**18.15** «Смешныя людзі». Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.25** Тэлебарометр.
**19.30** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**20.30** «Альбарутэнія».
**21.00** Баявік «У аблозе» (ЗША).
**23.00** Жывы гук.
**23.50** Канцэрт Jean Michel Jarre. Jarre in China (Францыя).

### РОССИЯ

**07.00** Мультфільмы.
**07.15** «Песні сапраўдных мужчын».
**08.40** Фільм «Калі бракуе кахання».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**13.40** «Уся Расія».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.50** «Улада факту». Дак. фільм.
**15.40** «Цалуй мяне мацней». Дакументальны фільм.
**16.40** «Пакой смеху».
**17.40** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Прэм'ера. Тэлесерыял «Сваты-4».
**00.30** «Дзяўчаты».
**00.45** Фільм «Сустрэнемся ля фантана».

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Жаночы погляд».
**14.10** Фантастычны баявік «Электра».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Развод па-руску».
**17.20** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Рускія сенсацыі».
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.20** «Музычны рынг НТБ».
**00.40** Прэм'ера. Містычны трылер «Люстэркі».

### EUROSPORT

**09.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Танцы. Адвольная праграма. Прамая трансляцыя.
**11.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Адвольная праграма. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**14.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Танцы. Адвольная праграма.
**15.30** Веласпорт. Трэк. Чэмпіянат свету (Каралеўства Нідэрландаў). Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**19.00** Веславанне. Оксфард - Кембрыдж. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Еўра-2012. Часопіс.
**20.15** Футбол. Еўра-2012. Часопіс.
**21.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Адвольная праграма. Жанчыны.
**22.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету ў Японіі (Токіо). Танцы. Адвольная праграма.
**00.00** Футбол. Еўра-2012. Абранае.
**01.00** Барацьба. Total KO.
**02.00** Барацьба. Total KO.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** На колах.
**08.00** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**08.45** «Таямніца Сагалі», серыял: 4 серыя.
**09.10** Калыханка для самых маленькіх.
**09.35** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**10.00** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**10.20** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**10.45** «Аляксандр Ісачоў. Майстар і Афрадыта», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**11.10** Госць «Белсату».
**11.25** Без рэтушы: «Вацлаў Іваноўскі», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**11.45** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**12.00** Два на два (тэледыскусія).
**12.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.00** «Таямніца Сагалі», серыял: 4 серыя.
**13.25** Калыханка для самых маленькіх.
**13.50** Рэпартэр.
**14.20** Сцяна, дак. цыкл.
**14.25** Маю права (прававаяя праграма).
**14.45** Невядомая Беларусь: «Гульня ў вайнушку», 2009 г., Польшча.
**15.15** Форум (ток-шоў): «Патрыёты і касмапаліты».
**16.00** Сцяна, дак. цыкл.
**16.10** «Ранча», серыял: 43 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 4 серыя .
**17.55** «Народжаныя для прытонаў», дак. фільм, 2004 г., ЗША.
**19.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Еўропа сёння.
**20.25** Вагон.
**20.30** «Расія ХХ стагоддзе. Погляд на ўладу», 2009 г., Расія: ч. 4.
**21.00** Аб'ектыў.
**21.15** Два на два (тэледыскусія).
**21.40** Сцяна, дак. цыкл.
**21.45** Суботні сеанс: «Мужчынскі клопат», камедыя, 1992 г., ЗША.
**23.20** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**23.45** Сцяна, дак. цыкл.
**23.50** Аб'ектыў

КАТАСТРОФА

# ВЯРТАННЕ ГАДЗІЛЫ

Алег НОВІКАЎ

**Тэма атамнай катастрофы вельмі папулярная ў японскай народнай культуры. Самы вядомы персанаж фальклору — пачвара па прозвішчу Гадзіла.**





Калі ў 1954 годзе на студыі Toho акцёр апрануўся ў гумавы касцюм тыраназаўра і пачаў перад камерамі зносіць лялечны горад, пабудаваны на студыйнай пляцоўцы, ніхто не думаў, што гэта ўсур'ёз. Лічылася, што здымаецца японскі адказ «Кінг-Конгу». Хіба з той розніцай, што галоўным героем была Гадзіла (імя прыдумаў прадзюсер Тамаюкі Танака).

Па сюжэту Гадзіла — гэта дагістарычная пачвара, якая доўгі час спала на дне акіяну і прачнулася пасля ядзернага бамбавання Хірасімы і Нагасакі ў 1945 годзе. Істота перажывае мутацыю пад уплывам радыяцыі, што робіць яе надзвычайна моцнай. Пасля Гадзіла атакуе Токіа, знішчае сталічную інфраструктуру.

Нягледзячы на прымітыўнасць фабулы, фільм выклікаў фурор. Карціна прынесла яе стваральнікам 9 мільёнаў долараў, хаця на яе вытворчасць пайшло 700 тысяч. Публіка патрабавала працягу. Гадзіла хутка стала візітнай карткай японскага кінематографу. За пяцьдзесят гадоў монстр захапіў экраны кінатэатраў усяго свету, пацясніўшы на другі план свайго прататыпа Кінг-Конга. Усяго пра Гадзілу было знята 29 фільмаў.

Паралельна кіно пра Гадзілу, пачвара прарвалася ў іншыя сферы: з 1991 года выходзіць кніжная серыя пра яе прыгоды. «Marvel» — слаўтае выдавецтва коміксаў — выпусціла асобную серыю, а ў дадатак увяло Гадзілу ў традыцыйныя сюжэты пра Чалавека-павука і г.д. Гэтага, аднак, аказалася мала. Супрацоўнікі выдавецтва прыдумалі новую серыю «New Mutants» пра сваіх атамных мутантаў.

Як толькі паўстаў сектар відэагульняў, там адразу з'явілася Гадзіла. Гэта здарылася ў далёкім 1983 годзе, калі кампутарны бізнэс рабіў першыя крокі. Апошняя гульня з удзелам Гадзілы выйшла ў пазамінулым годзе.

Шукаючы прычыны такой папулярнасці пачвары, культуролагі выявілі некалькі пластоў. Тэма монстраў з'явілася ў Японіі даўно. Відавочна, тут адыгралі сваю ролю рэшткі анімалістычных культаў. У фальклоры існаваў цэлы накірунак кайдзю — японскае слова, якое азначае «дзіўны звер». У казках кайдзю звычайна маляваліся як гарматнае мяса на службе больш вялікага зла. Некаторыя кайдзю — элітныя ваяры, якія служаць «правай рукой» у якога-небудзь Доктара-зло, і бываюць знішчаны станоўчымі героямі. Іншыя маюць нейтральны светапогляд і прыносяць людзям праблемы толькі ў стане лютасці.

Інтарэс да монстраў нечакана вырас у XX стагоддзі паралельна з працэсамі індустрыялізацыі і ўрбанізацыі краіны. Узнікла своеасаблівая калектыўная траўма, звязаная з тэмай шкоды, якую чалавек прычыніў прыродзе. Нарадзіўся страх таго, што рана ці позна прырода адпомсціць, наслаўшы цунамі або яшчэ нешта жудаснае. У даваенных коміксах было шмат герояў — жывёл, якія набылі незвычайную сілу і змагаюцца з чалавецтвам.

Апошнія карэктывы ў гэты працэс станаўлення галоўнага кайдзю зрабіла атамная бамбардзіроўка Нагасакі і Хірасімы і яе трагічныя наступствы. Радыяцыя стала абавязковай часткай плану помсты чалавецтву з боку прыроды, зрэшты, і сама Гадзіла — метафара атамнай зброі і атамнага кашмару.

Менавіта наступствам атамнай мутацыі стваральнікі сагі тлумачаць з'яўленне ў Гадзілы каласальнай моцы. Сама Гадзіла здольная дыхаць атамным агнём, яе арганізм — жывы атамны рэактар.

Так ці інакш, стваральнікі Гадзілы ўгадалі. Для японскай нацыі Гадзіла стала экранізацыяй таго, што адбывалася ў Нагасакі і Хірасіме. Не дарма кадры гэтай катастрофы ахвотна выкарыстоўвалі ў сваёй прапагандзе японскія пацыфісты, патрабуючы вываду з Японіі амерыканскай атамнай зброі або забароны атамнай энергетыкі.

Аднак па ходу таго, як раны ад атамных выбухаў зажывалі, месца Гадзілы ў японскім грамадстве змянілася. Хутка фільмы пра яе страцілі падтэкст паслання пра жудасці атамнай вайны. Ужо ў 5-м выпуску серыі Гадзіла становіцца абаронцам Японскіх астравоў ад іншых пачвараў.

У 1962 годзе на экраны выйшаў фільм «Гадзіла супраць Кінг-Конга». Усе японскія нацыяналісты глядзелі на бойку двух казачных монстраў як на спробу Японіі ўзяць рэванш за паразу ў 1945 годзе. Стваральнікі карціны нават думалі зняць два варыянты фіналу — адзін для амерыканскага гледача, другі — для японскага. У першым павінна была перамагчы Гадзіла, у другім — Кінг-Конг.

Тэма атамнай пагрозы, як і пагрозы з боку прыроды, у японскім грамадстве паступова пачала знікаць. Гэтаму спрыялі змены ў свядомасці японцаў, якія, у сваю чаргу, сталі вынікам эканамічнага буму, росту індывідуальнага спажывальніцтва, палітычнай стабільнасці.

Змянілася і Гадзіла. Яна стала амаль станоўчым персанажам, сталым атрыбутам дзіцячай індустрыі. Яе можна было пабачыць на цукерках, дзіцячых адзенні і г.д.

Тэма атамнага апакаліпсісу пачала ўспрымацца як нешта больш складанае. У адным папулярным коміксе, які выдаваўся на працягу 1980–1990-х гадоў, галоўны станоўчы герой — ахвяра радыяцыйнай мутацыі. Радыяцыя дала яму моц, якую ён ужывае ў барацьбе за добрую справу.

Аднак, як паказваюць апошнія падзеі, цалкам прыручыць атамную пачвару і замірыцца з прыродай не ўдалося. Коміксы, фільмы, кнігі пра Гадзілу, якая руйнуе Токіа, паліваючы ўсё атамным вогнішчам, перасталі быць забаўкамі і зноў нечакана аказаліся прароцкімі. Гадзіла вярнулася.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Расія сама збіраецца цалкам будаваць атамную станцыю і не плануе дапускаць беларусаў. Беларусы таксама спадзяюцца атрымаць 3 мільярда на развіццё інфраструктуры, хаця ўсе разумеюць, што да інфраструктуры грошы ніколі не дойдуць. Лукашэнку патрэбна валюта. Валюты ў казне няма зусім. Акрамя таго, наспела пытанне аплаты атрыманых з Расіі нафтапрадуктаў. Нафта быццам ідзе, вываз яе за мяжу ідзе, грошы на гэтым зарабляюць, але яны разыходзяцца імгненна. Праблем у эканоміцы столькі, што не хопіць ніякай валюты. Вось у чым бяда.

**«American Voice» (ЗША)**

Маштабная прыватызацыя «агульнанароднай» уласнасці — адзіны варыянт для Лукашэнкі здабыць грошы і, такім чынам, захаваць палітычную ўладу. На правядзенне рэформаў патрабуецца час, рэсурсы, кампетэнтныя кадры і многае іншае, чаго ва ўладаў Беларусі на дадзены момант няма. У перспектыве, пры ўдалым зыходзе, рэформы пашыраць падаткаабкладальную базу. Але гэта ў перспектыве, а сродкі патрэбныя сёння. Іх маглі б інвеставаць у нацыянальную эканоміку самі беларусы, у якіх на руках, па ацэнках экспертаў, ад 3,5 да 7 мільярдаў долараў. Але для гэтага неабходныя гарантыі ўласнасці, незалежнасць суда, прадстаўнічыя органы і многае з таго, што не ўпісваецца ў «беларускую мадэль». Тыя ж умовы (прынамсі, першыя дзве) запатрабуе любы інвестар. Таму з інвестыцыямі ў Беларусі справы ідуць кепска.

**REGNUM (Расія)**

На падтрыманне эканомікі Лукашэнку патрабуецца некалькі мільярдаў долараў. Эксперты кардынальна разыходзяцца ў лічбах — ад 3 да 10 мільярдаў. Адзін са спосабаў атрымаць фінансы — правесці прыватызацыю беларускіх дзяржпрадпрыемстваў. Мінск сігналізуе, што гатовы аддаць прыярытэт у прыватызацыі Маскве. А менавіта — «Сбербанку». Нядаўна Герман Грэф сустракаўся з Аляксандрам Лукашэнкам і прэм'ерам Беларусі Міхаілам Мясніковічам. Але гэта пакуль справа будучыні.

**«Московский комсомолец» (Расія)**

Беларусь мае ўсе шанцы стаць першай у гісторыі дзяржавай, у якой адбяруць права правядзення прэстыжнага міжнароднага спаборніцтва па палітычных прычынах. Аднак пакуль не ясна, якім чынам міжнародная супольнасць збіраецца націснуць на недэмакратычны рэжым Лукашэнкі «дэмакратычнымі» спартовымі метадамі. Справа ў тым, што ў статуце правядзення чэмпіянатаў свету па хакеі няма графы, якая прадугледжвае пазбаўленне краіны права правядзення чэмпіянату свету па чынніку аўтарытарнасці яе кіраўнікоў.

**«BBC» (Вялікабрытанія)**

У студзені гэтага года прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, выступаючы ў парламенце, заклікаў міністраў «жыць па сродках» і запатрабаваў «спыніць нарошчванне дадатковых пазыковых абавязальніцтваў». Але, мабыць, гэты пастулат да еўрааблігацый не тычыўся. Таму што старшыня кіравання Нацбанка Беларусі Пётр Пракаповіч заявіў пра намер краіны пазычыць да 2012 года на знешніх рынках да 2 мільярдаў долараў.

**«Deutshe Welle» (Германія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ФРАНЦЫЯ. ПРАВЫЯ РАДЫКАЛЫ СТВАРАЮЦЬ СВОЙ ПРАФСАЮЗ



Партыя Нацыянальны фронт (FN), лідарам якой нядаўна стала Марына Ле Пэн, заявіла пра пачатак стварэння свайго прафсаюзнага цэнтра; працоўная назва сіндыкату: Нацыянальны гурток абароны працоўных — сяброў прафсаюзаў (CNDTS). Як выходзіць са складанай назвы, канцэпцыя новага прафсаюзу не столькі ў тым, каб змагацца за класавыя правы, колькі ў тым, каб сеяць недавер да кіраўніцтва ў буйных прафсаюзах. Дарэчы, праблема карупцыі і коснасці прафсаюзаў сапраўды існуе. Стварэнне CNDTS значыць новую фазу вайны паміж FN і прафсаюзнымі цэнтрамі, якія традыцыйна лічаць сябе прыналежнымі да левага флангу. Напярэдадні прафсаюзы CGT і FO выключылі са сваіх шэрагаў актывістаў, якія збіраюцца ісці ў мясцовыя парламенты ад FN. Пакуль цяжка прагназаваць, якія наступствы будзе мець ініцыятыва Марыны Ле Пэн. Так ці інакш, яна адлюстроўвае тое, што FN усур'ёз спрабуе згуляць на сацыяльных праблемах. Варта таксама згадаць, што FN і раней спрабаваў пранікнуць у рабочы асяродак, аднак без поспехаў.

**Па матэрыялах «Le Figaro» (Францыя)**

### УКРАІНА. ВЯРТАННЕ ТЭРОРУ АУН



На Украіну вярнуліся тэрарысты з арганізацыі АУН (Арганізацыя ўкраінскіх нацыяналістаў). Менавіта АУН узяла адказнасць за дзве апошнія гвалтоўныя акцыі ў Кіеве. Праўда, гэтыя акцыі слаба нагадваюць вядомыя ўчынкі АУН 1920–1930-х гадоў, кшталту замаху на прэзідэнта Польшчы, забойства польскага міністра ўнутраных спраў, забойства галоўнага заходнеўкраінскага савецкага пісьменніка Яраслава Галана. На гэты раз усё значна больш банальна. У дзвюх кіеўскіх крамах, дзе адмовіліся прымаць на працу кандыдатак з-за таго, што яны размаўляюць на украінскай мове, сябры АУН пабілі вітрыны. На першы погляд — нічога асаблівага. З іншага боку, справа вакол украінскамоўных дзяўчын нарабіла шмат шуму. Нагадаем, напачатку студзеня 2011 года ў Кіеве не ўзялі на працу нейкую Алену Воранаву нібы з-за таго, што яна размаўляе па-украінску. Дзяўчыне, па яе словах, паведамілі, што ёй неабходна перайсці на рускую мову, калі яна сапраўды мае намер працаваць у гэтай установе. Таксама кіраўніцтва крамы здзівілася, навошта ёй «гэтая мова». У выніку фірме давялося паплаціцца за знявагу ўкраінскай мовы. Праўда, наколькі Алене дапамогуць выбітыя шыбы, цяжка сказаць.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### НІКАРАГУА І КОСТА-РЫКА НА ПАРОЗЕ ВАЙНЫ

Міжнародны прававы трыбунал у Гаазе спрабуе не дапусціць вайны паміж Нікарагуа і Коста-Рыка. Casus belli — востраў на рацэ Сан-Хуан, якая з'яўляецца натуральнай мяжой паміж краінамі. Кожная з дзяржаў з 2010 года лічыць, што востраў належаць ёй. Пасля таго, як у мінулым лістападзе кіраўніцтва Нікарагуа вырашыла звязаць раку з Ціхім акіянам каналам, Коста-Рыка палічыла гэта пагрозай для сваёй нацыянальная бяспекі. На мяжу аператыўна былі высунутыя войскі (трэба зазначыць, што ў краіне няма рэгулярнай арміі, а толькі апалчэнне). У сваю чаргу, Манагуа таксама адправіла на бераг Сан-Хуану вайсковыя фармаванні, праўда, матывуючы гэта неабходнасцю барацьбы з крыміналам. Пасля рашэння трыбуналу на мінулым тыдні нікарагуанцы пагадзіліся адвесці войскі ад мяжы. Аднак наўрад ці гэта азначае канец канфлікту. Нікарагуанцы і коста-рыканцы гістарычна не любяць адзін аднаго. Акрамя таго, у Манагуа пры ўладзе сандыністы, якія памятаюць, што ў 1980-я гады Коста-Рыка была плацдармам для атакі на сацыялістычную Нікарагуа.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

ГЕАПАЛІТЫКА

# МЯНЯЕМ ЁД НА КУРЫЛЫ

*Алег НОВІКАЎ*

**Расія спрабуе выкарыстаць падзеі ў Японіі, каб перафарматаваць адносіны з Токіа ў пазітыўны бок і канчаткова вырашыць «пытанне Курылаў».**

Нагадаем, з 1945 года Японія прэтэндуе на паўднёвую частку Курыльскай грады, спасылаючыся на двухбаковы Трактат пра гандаль і межы ад 1855 года. Вяртанне гэтых астравоў Токіа паставіў умовай мірнай дамовы з Расіяй, якая пасля другой сусветнай вайны так і не была падпісана.

Пазіцыя Масквы заключаецца ў тым, што паўднёвыя Курылы ўвайшлі ў склад СССР па выніках раскладу, які ўзнік пасля другой сусветнай вайны і мае адпаведнае міжнародна-прававое афармленне.

Старая спрэчка ў чарговы раз абвастрылася пасля наведвання міністрам абароны РФ Анатолем Сердзюковым гарнізонаў на выспах Ітуруп і Кунашыр. 7 лютага, які адзначаецца ў Японіі як Дзень Паўночных тэрыторый, японскі прэм'ер Наота Кан назваў візіт Мядзведзева на Курылы ў лістападзе 2010 года «грубіянствам». У той жа дзень японскія радыкалы прыйшлі да пасольства РФ у Токіа з парванымі сцягам Расіі, а затым «падмялі» імі тратуар.

Расійская дыпмісія перадала ў японскі МЗС ноту з патрабаваннем прыняць меры па крымінальным праследзе асобаў, якія здзейснілі здзек са сцяга замежнай дзяржавы. Аднак японскі бок палічыў, што ўльтраправыя здзекаваліся не са сцягу РФ, а з «самаробнага прадмету падобнага на сцяг», які яны не лічаць дзяржаўным сімвалам Расіі.

Свайго піка канфрантацыя дасягнула напярэдадні Дня абаронца айчыны. У інтэрнэце пачалі гуляць чуткі пра тое, што, быццам, амбасадар Японіі выклікаў усіх кіраўнікоў прадстаўніцтваў японскіх кампаній у Маскве і загадаў сядзець на валізках, быць гатовымі ў любую хвіліну да вяртання на радзіму. Пры гэтым ён нібыта сказаў: «Урад нашай краіны разглядае магчымасць вайны з Расіяй з мэтай вяртання паўночных тэрыторый. Насельніцтва Японіі складае 125 мільёнаў чалавек, а насельніцтва Расіі —140 мільёнаў. Гэта цалкам нармальныя ўмовы для вядзення пераможных баявых дзеянняў, з улікам таго, што войска РФ у недасканалым стане, а ўрад не гатовы для таго, каб ужыць ядзерную зброю».

Сыходзячы з гэтага шматлікія блогеры прапаноўвалі Мядзведзеву на ўсіх парах ляцець у Пекін, Ханой, Джакарту, Сеул — краіны-працаўнікі Японіі ў часы другой сусветнай вайны, і ладзіць з імі антыяпонскі рэгіянальны блок.

Афіцыйныя ведамствы РФ плёткі і парады праігнаравалі. Аднак падставы для эмоцый у іх, напэўна, былі. Хаця б таму, што па выніках галасавання ў інтэрнэце стала відавочна: пакласці сваё жыццё за далёкія выспы расіяне жаданнем не гараць. 68 працэнтаў удзельнікаў адпаведнага апытання ў той ці іншай форме заявілі, што ў выніку вайны стануць дэзерцірамі.

І тут адбыліся землятрусы ў Ціхім акіяне. Прадстаўнікі расійскага знешнепалітычнага ведамства адразу выказалі надзею, што стыхія дапаможа прыглушыць тэрытарыяльную спрэчку і зблізіць Токіа і Маскву гэтак жа, як тэракт 11 верасня зблізіў Расію і ЗША ці авіякатастрофа пад Смаленскам — Расію і Польшчу.

«Цяпер наша задача — дапамагчы японцам нармалізаваць сітуацыю з гэтым кашмарам, а не думаць пра нейкія прагматычныя рэчы», — цытуе «Коммерсант» сваю крыніцу на Смаленскай плошчы. — Але хацелася б верыць, што ўсе гэтыя падзеі створаць новую атмасферу ў адносінах».

Расія апынулася адной з першых краін, якія прапанавалі Японіі дапамогу ў барацьбе з наступствамі стыхійнага бедства. Прэзідэнт Мядзведзеў апярэдзіў шматлікіх сваіх калегаў, накіраваўшы пасланне са спачуваннямі 12 сакавіка. Масква накіравала ў Японію два атрады вывратавальнікаў і абсталяванне. У панядзелак кіраўнік дыпламатычнага ведамства Сяргей Лаўроў прыехаў да японскай амбасады ў Маскве.

Мяркуючы па ўсім, Токіа вырашылі дацiскаць усе. Уладзімір Жырыноўскі нечакана запрасіў усю японскую нацыю перасяліцца ў Расію, а пракрамлёўская моладзевая арганізацыя «Маладая гвардыя» на чале з экс-шпіёнкай Ганнай Чапман адмовілася ад запланаванай паездкі на Курылы.

Актыўнасць Расіі на ўсходнім накірунку была заўважаная ў заходняй прэсе. «Японія атрымлівае газ і вугаль ад гістарычнага суперніка», — піша ўплывовая амерыканская газета «The Christian Science Monito». Журналіст адзначае: «Напярэдадні землятрусаў узаемаадносін Масквы і Токіа былі вельмі прахалоднымі з-за абвастрэння тэрытарыяльнай спрэчкі. Аднак тое, што Расія шчыра і шчодра адгукнулася на японскую бяду, можа спрыяць паспяховаму вырашэнню праблемы тэрытарыяльнага пытання пасля таго, як наступствы катастрофы будуць ліквідаваны».

Аднак пакуль надзеі Расіі на тое, што двухбаковы канфлікт будзе лягчэй вырашыць на фоне салідарнасці і падтрымкі, не працуе.

«Трагічная сітуацыя, у якой апынулася Японія з-за разбуральнага землятрусу і цунамі, не паўплывае на рашэнне тэрытарыяльнай спрэчкі. Гэта зусім іншая тэма», — заявіў амбасадар Японіі ў Маскве Масахару Кона.

Зрэшты, гэта было сказана яшчэ да таго, як сталі паступаць жудасныя навіны з японскіх АЭС. Нельга выключаць, што Японіі, як у 1945 годзе, давядзецца вырашаць больш глабальныя пытанні нацыянальнай бяспекі і, як у 1945-м, пра лёс двух маленькіх астравоў забудуць. У любым выпадку, аказаная Расіяй дапамога палепшыць імідж краіны ў асяроддзі простых японцаў, што будзе вельмі важна ў будучым, калі мясцовыя нацыяналісты зноў паспрабуюць узняць тэрытарыяльнае пытанне.




Межы паміж Японіяй і Расіяй/СССР у 1855, 1875 і з 1945 года на Курылах

ЦІКАВА

# У НАС ЁСЦЬ ПАПА

Алег НОВІКАЎ

**Увесь каталіцкі свет рыхтуецца да прызначанай на 1 мая беатыфікацыі Яна Паўла II. Рыхтуюцца і антыклерыкалы. 15 красавіка ў сусветны пракат выходзіць антыпапская камедыя «Habemus papam» (лац.: «Маем Папу» або «У нас ёсць Папа»).**





Праўда, стваральнікі стужкі (рэжысёр Нані Марэці) упарта кажуць, што фільм непасрэдна ніякім чынам не звязаны з фігурай Папы Яна Паўла II. Стваральнікі «Habemus papam» быццам мелі намер адлюстраваць актуальную праблему крызісу даверу паміж Касцёлам і вернікамі. Акрамя таго, яны не хаваюць, што проста жадалі зарабіць грошы на істэрыцы вакол беатыфікацыі. Сапраўды, тэма Папы гэтай вясной — залатая жыла. Відавочна, што засілле рэлігійнай тэматыкі ў СМІ выкліча сярод пэўных груп насельніцтва запыт на нешта альтэрнатыўнае. Тым больш, яны не пройдуць міма афішаў з абвесткамі, што ў свет выйшла ці не першая ў гісторыі камедыя пра Папу.

«Habemus papam» — гэта аповесць пра аднаго кардынала, які дзякуючы выпадковым акалічнасцям (у тым ліку амбіцыям свайго дарадчыка) нечакана абіраецца лідарам каталікаў усяго свету. Аднак праз нейкі час знаходжання на Святым троне ў новага Папы губляецца інтарэс да сваёй місіі. Ён упадае ў глыбокую дэпрэсію, забывае пра свае прафесійныя абавязкі. Асабісты крызіс Папы дэзарганізуе жыццё не толькі Ватыкану, аднак і каталіцкай грамады ва ўсім свеце.

На дапамогу зноў прыходзіць дарадчык, якога зграў выдатны польскі артыст Ежы Оскар Штур. Клерку даводзіцца прыдумаць нешта экстраардынарнае, каб удыхнуць у пантыфіка новыя сілы і веру ў значнасць сваёй працы. Адным словам, як кажа рэжысёр, гэта фільм пра духоўны крызіс мужчыны сталага ўзросту, які вымушан выконваць нецікавую яму працу і шукае сродкі тэрапіі.

Аднак мала хто верыць у тое, што «Habemus papam» з'явіўся на свет толькі таму, што Марэці вырашыў пакапацца ў праблемах духоўнага крызісу сталых мужчын або захацеў трохі абагаціцца за кошт ватыканскай тэматыкі.

Пра правакацыйны характар фільму гаворыць ужо прозвішча рэжысёра. Марэці нарадзіўся ў 1953 годзе ў сям'і настаўнікаў. У 1973-м зняў свой першы кароткаметражны фільм. Ужо другі яго поўнаметражны фільм трапіў у Каны і атрымаў Залатую пальмавую галінку. Рэжысёр таксама мае Срэбнага мядзведзя — прыз Берлінскага кінафестывалю. Яшчэ адно захапленне Марэці — водная пола. Ён гуляе за каманду другой лігі італьянскага чэмпіянату.

Нарэшце, Марэці — пераканаы лявак. Ён з'яўляецца адным з самых вядомых арганізатараў кампаніі супраць Берлусконі і нават зняў стужку «Kajman», скіраваную супраць прэм'ера. Наўрад ці заўзяты левы актывіст Марэці пажадаў зняць фільм пра Папу, не маючы намеру падарваць аўтарытэт Касцёла.

Акрамя таго, Марэці знайшоў на галоўную ролю акцёра, які знешне вельмі падобны на Папу Яна Паўла II (яго зграў француз Мішэль Пікалі). Персанаж Мішэля Пікалі на экране шмат у чым нагадвае Караля Вайтылу ў жыцці. Напрыклад, яны абодва захапляюцца тэатральным мастацтвам. Ежы Штур у якасці дарадчыка Святога айца паміж волі выклікае аналогіі з палякам Станіславам Дзівішам — сакратаром Яна Паўла II.

Сыходзячы з падобных асацыяцый, інтарэс публікі да новага фільму ў дні, калі ўсе будуць казаць выключна пра Яна Паўла II, папросту гарантаваны.

Гэта можа выклікаць скандал нават у краінах, дзе жанр антыклерыкальнага мастацтва дастаткова стары і вядомы.

Брытанская «Guardian» лічыць, што фільм Марэці — самае апошняе з таго, што патрэбна зараз Папе Бенедыкту. І не толькі таму, што кінатвор здольны нанесці ўдар па аўтарытэту Касцёла — самыя смешныя сцэны, як пішуць кінакрытыкі, звязаныя з побытам кардыналаў. Персанаж Мішэля Пікалі нагадвае не толькі Вайтылу, аднак і Ёзэфа Алаіза Ратцынгера, сённяшняга Папу. Як і галоўны герой стужкі, Ёзэф да таго, як стаць Папам, быў вельмі абыякавым у сваіх амбіцыях, лічыў, што папскі пасад — не ягонае прызначэнне.

Яшчэ больш можа абурыцца Усход Еўропы, дзе кіруюць клерыкальныя палітыкі. Ужо зараз шмат хто мае сумнеў наконт таго, што фільм Марэці трапіць у польскія кінатэатры. Наўрад ці яго пагодзяцца «круціць» у Славакіі і Харватыі. Зачыненыя фільму шлях і ў Венгрыю.

Зразумела, што асобна ў спісе краін, дзе праца Марэці будзе нон-грата, стаіць Польшча. Тут асобе Яна Паўла II надае павагу і ліберальная эліта, памятаючы, якую ролю Вайтыла адыграў у працэсах трансфармацыі краіны ад аўтарытарызму да дэмакратыі. Нават без паказу ў кінатэатрах сам факт з'яўлення стужкі, а тым больш удзел у ёй польскага акцёра ўжо зрабіў рэзананс. У лепшым выпадку, шмат для каго гэты фільм — проста нонсэнс. У горшым — знявага нацыянальнага гонару, замах на духоўныя каштоўнасці.

Сам Ежы Штур згодны з тым, што праблемы непазбежныя. Аднак лічыць, што рашэнне здымацца ў Марэці было правільным. Кажа, што хацеў бы абараніць права каталіка на сумненне і ўнутраны пошук. Ён лічыць, што фільм прымусіць Касцёл не губляць адчуванне часу. Самае моцны аргумент Ежы — перад тым, як здымаць свой фільм, Марэці даслаў сцэнар у Ватыкан на кансультацыю. Рэакцыя была дастаткова пазітыўная.

Акрамя таго, італьянскі кінематограф любіць гуляць з тонкімі тэмамі і робіць гэта вельмі элегантна. Усе памятаюць, які поспех меў фільм Раберта Беніні «Жыццё цудоўнае», што ў камедыйнай манеры абыграў такую цяжкую праблему, як Халакост.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### СЯРГЕЙ МІРОНАЎ



Партыі «Справядлівая Расія» (СР), старшынёй якой з'яўляецца Міронаў, вельмі добра выступіла на рэгіянальных выбарах, якія прайшлі ў Расіі ў мінулыя выходныя. Аднак гэта выклікала дзіўную рэакцыю ў Крамлі, па ініцыятыве якога СР у свой час і была створаная як праект лаяльнай левай апазіцыі. Пайшлі гуляць плёткі, што Міронава вось-вось здымуць, а на яго места паставяць Дзмітрыя Рагозіна, былога правадыра партыі «Родина». Апошні доўга працаваў прадстаўніком Расіі пры ЕС. Называюць і дату ракіроўкі — 16 красавіка, калі адбудзецца чарговы з'езд эсэраў. Эксперты спрабуюць зразумець, нашто мяняць Міронава? Найбольш верагодны адказ — нездольнасць Міронава і яго каманды цалкам перацягнуць на сябе левы электарат, які працягвае галасаваць за КПРФ. Прыход на пасаду лідара СР амбіцыйнага і энергічнага Рагозіна мог бы стаць імпульсам развіцця для партыі. Праўда, Рагозін больш вядомы не як сацыяліст, а хутчэй як нацыяналіст. З іншага боку, тэма этнічнай (каўказскай) пагрозы зараз значна больш актуальная для расійскага выбаршчыка, чым сацыяльная праблематыка. І аўтарытэтны ў асяроддзі патрыётаў Рагозін можа дапамагчы Крамлю трымаць нацыяналістычны дыскурс у зададзеных рамках.

### НУРСУЛТАН НАЗАРБАЕЎ



Прэзідэнт Казахстана адкрыта выступіў супраць нашэння жанчынамі Казахстана, асабліва маладымі, мусульманскага адзення. «Я катэгарычна супраць паранджы, асабліва калі паранджу ці хіджаб носяць студэнткі ці моладзь, якая вучыцца. У нас ніколі такога не было ў гісторыі, наша рэлігія не мела такой традыцыі. Трэба ўмець адрозніваць праўдзівую рэлігію ад навязанай нам», — сказаў Назарбаеў на сустрэчы з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі ў горадзе Туркестан. Прэзідэнт Казахстана дадаў: «Мы з павагай ставімся да ўсіх прадстаўнікоў мусульманства, але ў нас свой шлях». Вайна з хіджабам унесла хоць нейкае ажыўленне ў ход прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, вынікі якой усім вядомыя з-за таго, што апазіцыя іх байкатуе. У Астане некалькі ісламістаў на знак пратэсту пачалі бестэрміновую галадоўку. Праўда, чамусьці ў акцыі бяруць удзел выключна мужчыны. Таксама варта згадаць, што раней Назарбаеў называў казахаў сапраўднымі мусульманамі.

### РАУЛЬ КАСТРА

Кубінскі прэзідэнт, які адначасова выконвае функцыі прэм'ера, абвясціў пра дэвальвацыю peso cubano convertible на восем працэнтаў да долару ЗША. Peso cubano convertible (PCC) — паралельная нацыянальная валюта, якой іншаземцы на Кубе могуць разлічвацца за тавары і паслугі. Гэта накшталт валютных чэкаў, якія адзін час існавалі ў СССР. Паралельная валюта была прыдуманая ў 2004 годзе для таго, каб нейкім чынам папоўніць валютныя рэзервы. Наколькі peso cubano convertible дапамог гэтаму, цяжка сказаць, аднак хаосу рэформа нарабіла шмат. Менавіта з мэтай унесці больш яснасці і адбылася дэвальвацыя, як піша афіцыёз. У цэнтральных газетах таксама пішуць, што дэвальвацыя прыцягне замежнага інвестара і турыстаў. Называецца лічба: сто мільёнаў долараў — столькі краіна быццам заробіць дзякуючы дэвальвацыі. Праўда, газеты не пішуць, што замежныя турыстычныя кампаніі заклікаюць Гавану цалкам адмяніць прынцып паралельных валют. Таксама газеты ігнаруюць думку простага кубінца, якому PCC цяпер будзе каштаваць на пару песа даражэй. Між тым, практычна ўсе непаўсядзённыя тавары на Кубе можна набыць толькі за PCC.



▸ ЛЁСЫ

# МЕЛОДЫІ АЛЕСЯ КАМОЦКАГА

**Калі ў мяне гасцяваў сябар з Кіева, я прапанаваў яму паслухаць новыя версіі старых песняў і назваць арыгінал. Як чакалася, ён ні разу не памыліўся, бо хто ж з нашага пакалення не ведае макраўсаўскую «Гармонь» альбо «Старый клён». Як і я, ён шчыра здзіўляўся крэатыўнасці самой ідэі — праспяваць па-новаму хіты мінулых гадоў на беларускай мове.**

**Аўтар ідэі і ён жа выканаўца — Алесь Камоцкі.**



Фота Артура Прупаса

## Ноты дзяцінства

Нарадзіўся я ў Барысаве 9 чэрвеня 1958 года. Там жа пайшоў у сярэднюю школу №1, якая была недалёка ад хаты. У 1975 годзе бацькі адпусцілі мяне «ў свет». Я паехаў у Маладзечна ў музычную вучэльню, з якой выйшаў вядомы спявак і кампазітар Юры Антонаў. Правучыўся там толькі адзін год, бо забралі ў войска. Служыў у Варонежы. Дзякуючы вучобе ў музвучэльні, адразу трапіў у аркестр. Амаль увесь час мы гралі на пахаваннях вайскоўцаў, якіх там было вельмі багата. Варонеж — горад, дзе жыло шмат адстаўнікоў, а вайсковых аркестраў там было, здаецца, усяго два. Зразумела, яны выкарыстоўваліся даволі актыўна. Гэтак жа, як і на дэманстрацыях 7 лістапада і 1 мая.

У 1979 годзе я дэмабілізаваўся і вырашыў не працягваць музычную адукацыю. Хацелася вучыцца на больш высокім узроўні. Пра гэта я думаў на працягу апошніх месяцаў службы. І «дадумаўся» да філасофскага аддзялення гістфака БДУ.

Упэўненасці, што паступлю адразу ж, у мяне не было, таму на ўсялякі выпадак запісаўся яшчэ і на падрыхтоўчае аддзяленне. Аднак мама параіла рызыкнуць. На сваё здзіўленне, я паступіў з першай спробы.

Мая мама, Ніна Уладзіміраўна Пацэева (у дзявоцтве Казлоўская), захавала свае прозвішча ад першага мужа, які загінуў у 1942 годзе. Мамін бацька Уладзімір Канстанцінавіч Казлоўскі мяне ў дзяцінстве і выхоўваў. На жаль, калі я вучыўся ў другім класе, ён адышоў у лепшы свет.

Бацьку звалі Верамей Герасімавіч Камоцкі. Ён родам з маленькай вёскі Разрыўка. Па цяперашняй геаграфіі, гэта Барысаўскі раён. Лёс у яго быў складаным, але расказваць пра сябе бацька не любіў. Бацькаву біяграфію я ўяўляў толькі ў асноўных рысах, а калі яго ўжо не было, капаўся ў паперах, каб мець уяўленне пра яго жыццёвы шлях. Зразумела, поўнай карціны не атрымалася, але некаторыя дэталі высветліць удалося.

У 7-гадовым узросце ён застаўся без бацькоў і жыў у заможнага дзядзькі. Дапамагала і тое, што ён разам са сваёй цёткай іграў на нейкіх вяселлях. Як потым казаў, «іграў у скрыпачку». Яна, дарэчы, захавалася ў мяне па гэты дзень. На прафесійным узроўні ён граць так і не навучыўся, але некаторыя танцы мог «папіліць».

Ён працаваў у розных месцах, у тым ліку грузчыкам, але пастаянна за поясам была кніжка. Паціхупаціху вывучыўся на настаўніка, але пачалася вайна, і папрацаваць яму не далі.

Паваяваў нядоўга, да канца 1941 года. Іх разлік трапіў пад нямецкую бомбу. Каго пазабівала, каго параніла. Майму бацьку пашанцавала. Застаўся жывы, але да канца вайны быў у розных шпіталях недзе ў Казахстане. Адна нага так і засталася пакалечанай. Да канца жыцця хадзіў «з кіёчкам», з чаго даволі часта жартаваў.

Калі потым вярнуўся ў Магілёў, дзе працаваў да вайны, атрымалася, што былая сям'я яго не прыняла. Гадоў з дзесяць жыў адзін, пакуль не «прыбіўся» да мамы.

## Акорды юнацтва

Пазней мама расказвала, што тады бацька надта любіў выпіць, але я яго такім не помню. Больш за тое, не помню, каб паміж імі былі нейкія сур'ёзныя канфлікты.

Я многа за што ўдзячны сваім бацькам, але найперш за тое, што не лупілі і «не ганялі». Перавага аддавалася іншым метадам уплыву. Маральным. Самым жорсткім пакараннем для мяне было, калі мама крыўдзілася і не хацела са мной размаўляць.

Бацькі давалі многа самастойнасці ў вучэнні. Мяне нават не правяралі наконт вывучаных урокаў. Дастаткова было сказаць, што яны зроблены. Пасля восьмага класа такія пытанні бацькі наогул задаваць перасталі.

Калі бацька не ведаў адказу на якое-небудзь маё пытанне, то абавязкова вяртаўся да яго пазней, праз дзень-два. Яго няма з 1987 года, але час ад часу я заўважаю за сабой выкарыстоўванне нейкіх бацькавых словаў і прыказак. Не карыстаючыся рэменем, ён, так бы мовіць, «загнаў мне сваю навуку пад скуру». Па жыцці гэта дапамагае вельмі істотна. Адным з самых маіх любімых быў настаўнік па батаніцы Сяргей Емяльянавіч Лісоўскі. Каля школы месціліся яго грады. Замест заняткаў па спевах я мог разам з Сяргей Емяльянавічам пакапацца ў зямлі. Ён быў вельмі рады.

Бацька закрыўдзаваў на ўсё гэта і сказаў: не можа быць, каб у майго сына адсутнічаў музычны слых. Неяк «прыткнуў» мяне ў музычную школу. Карацей, я скончыў там клас акардэону, але толькі з-за настойлівасці бацькі. Спрачацца з ім не стаў, а праз пэўны час і сам троху «загараўся» музыкай. Самастойна навучыўся граць на саксафоне. Пры Доме піянераў быў эстрадны аркестр — там і «дудзеў». На тыя часы гэта выглядала вельмі эфектна: мне павязалі піянерскі гальштук, а я «выдаў» сола — «Орлёнок, орленок, взлети выше солнца…».

Спрабаваў граць іншыя рэчы, але цягнулася ўсё нядоўга. Паступіў на клас кларнета ў музвучэльню, аднак хутка зразумеў, што гэта «не маё»…

Цікавая рэч жыццё. Тады я думаў, што ўвогуле не буду граць, а зараз са мной пагаджаюцца працаваць лепшыя музыкі краіны. Пра ўсё гэта некалі варта напісаць асобную кнігу.

## Партытура жыцця

Мае аднакурснікі па «філасофіі» БДУ сталі значнымі асобамі ў гэтай галіне — прарэктар, загадчык кафедры, нядрэнныя выкладчыкі. Некалькі гадоў таму мы збіраліся «на каву» і адзін з іх кажа: «Здавалася б, я ў жыцця дабіўся вельмі многага да чаго імкнуўся, а часам зайздрыкі бяруць. Вось — Камоцкі. Яму ўжо пад палціннік, а ён расказвае, што яшчэ ходзіць вучыцца да нейкага выкладчыка па вакалу, будуе планы, хоча нечага новага».

Дарэчы, першы раз да выкладчыка па вакалу я сапраўды пайшоў у 49 гадоў.

Канешне, чуць тыя словы аднакашніка было прыемна, але я ўжо даўно для сябе зразумеў, што буду жыць, пакуль буду вучыцца. А вучыцца ў жыцця ёсць чаму заўсёды. Як свядчаць вучоныя, свой фізічны, разумовы і маральны рэсурс чалавек выкарыстоўвае на вельмі сціплы працэнт. Ёсць нават тэорыя, што свет развіваецца дзякуючы чалавечай ляноце.

Мы часта даволі абыякава і няўважліва ставімся да таго, што адбываецца вакол. Часта не заўважаем простыя рэчы, якім трэба шчыра радавацца. Напрыклад, змену часоў года, моманты, калі дзень роўны ночы. Упэўнены, гэта значна бліжэй да цуду.

Па-сапраўднаму мяне «прабіла» да музыкі і паэзіі толькі ў БДУ, хаця, здавалася, за плячамі ўжо была першапачатковая музычная адукацыя. Пачаў пісаць вершы. У школе я не разумеў нават, навошта яны патрэбныя. Размаўляеш нармальна, людзі цябе разумеюць — а тут нейкія рыфмы? Тое, што паважаюць людзей, якія, напрыклад, умеюць стругаць дошкі, — нармальна, а якую матэрыяльную карысць прыносяць паэты?

У войску пачаў нешта «крэмзаць» у блакноце, але гэта было хутчэй ад суму. Пазней стаў нешта спяваць пад гітару, але гэта былі выключна чужыя вершы. Самая моцнае ўражанне тых часоў — творчасць Караткевіча. У школе яго не выкладалі. Спачатку захапілі дэтэктывы «Дзікае паляванне караля Стаха» і «Чорны замак Альшанскі», а калі прачытаў яго вершы, уражанне было такім моцным, што пачаў іх спяваць. Дарэчы, у той жа перыяд адкрыў для сябе і Уладзіміра Жылку.

Праз пэўны час перастаў саромецца пісаць сам. А потым лёс звёў мяне з паэтам нумар адзін сучаснай Беларусі — Рыгорам Барадуліным. Разам з ім напісана даволі шмат песняў. Я нават рызыкнуў яму паказаць свае вершы. Рыгор Іванавіч нічога там не правіў. Мы проста размаўлялі. А потым мне самому станавілася зразумелым, што і дзе трэба зрабіць інакш. Сябруем ужо каля 15 гадоў.

Свой першы магніта-альбом я запісаў у 1985 годзе. Тады гэта зрабіць было вельмі цяжка, бо прыватных студыяў яшчэ не існавала. Запісаў яго на беларускім тэлебачанні, але не ў студыі, а на буфетным складзе. Вакол стаялі скрыні з пустымі шклянкамі. Мы зацягнулі туды пульт, паставілі мікрафоны і пісалі адразу на касетную дэку, бо ніякіх там раздзяленняў не было. У мяне атрымаўся самы лепшы запіс. На жаль, пасля яго па п'янцы (смяецца — А. Т.) я недзе згубіў. Копіі потым знайсці атрымалася, але гэта ўжо не тое, бо арыгіналу не захавалася. Назву таму запісу даў даволі пафасную — «Першы сшытак». З гадамі іх сабралася нямала — каля дзесяці альбомаў. Бывае, на канцэртах людзі просяць мяне праспяваць песню, якую сам зараз амаль не помню. Прыемна, што нехта іх ведае і помніць.

## Музыка лёсу

Як і многія філасофы, я працаваў па спецыяльнасці. То бок — кім давядзецца. Нават адной чы шабашыў на будаўніцтве, а потым вырабляў мэблю. Дыплом, канешне, ёсць, і з нейкай нагоды яго можна паказаць, але які сэнс? Адночы хацеў здаць яго ў букіністычны магазін… Дыягену дыпломы былі не патрэбныя.

Граць на гітары пачаў яшчэ падчас універсітэцкай вучобы. Праз яе і пазнаёміўся з будучай жонкай Касяй Чалей. Яна таксама спявала песні пад гітару. Маленькая такая, худзенькая, але вельмі важная. Я нават падступіўся да яе не сам. Нас пазнаёмілі мае сябры. Паспрабавалі спяваць разам. Дуэт назвалі «Кася і Алесь». Не мы — іншыя. Менавіта такая назва была надрукавана ў адной з газет.

Паспявалі-паспявалі, а потым атрымалася неяк так, што я ажаніўся. Каталізатарам таго працэсу была Кася, бо я як быў тады «цельпуком», «мядзведзем», так і застаўся ім па гэты дзень.

Вяселле было ў 1982 годзе. Дакладней, у «класічным» выглядзе яго і не было. Адразу пасля таго, як мы ў загсе распісаліся і абмяняліся кольцамі, бацька Касі Альфрэд Васільевіч адвёз нас у аэрапорт, адкуль мы паляцелі ў Піцер.

Гэта была мая ініцыятыва. Яшчэ за два месяцы да роспісу я папярэдзіў, што ніякай п'янкі не будзе, бо я купіў білеты на рэйс, што праз дзве гадзіны пасля роспісу. Больш за тыдзень мы «гойсалі» па Піцеру. Кася прыляцела туды ў шлюбнай сукенцы, а я з жывой кветкай у валасах. Такімі да месца нашай «дыслакацыі» нас і прывёз таксіст. Мы адразу ж патэлефанавалі ў Мінск, дзе пілі за нас, а мы там параўноўвалі беларускую «Пшанічную» гарэлку, якую прывезлі з сабой, з мясцовай.

Калі вярнуліся дамоў, аднакурснікі не далі нам «зажаць мерапрыемства», і мы яшчэ месяц святкавалі. Кася вучылася таксама ў БДУ, на гісторыка. Толькі на год пазней за мяне. Пасля сканчэння БДУ я некаторы час працаваў у тэатры «Дзея» ў Міколы Трухана. Зразумела, не артыстам — спяваў песні.

Фармальна мы пражылі разам з Касяй дзевяць гадоў і развяліся ў 1991 годзе. Абодва вырашылі — колькі можна? Сябруем па гэты дзень. Толькі праз некалькі год пасля разводу я па-сапраўднаму адчуў, што мы радня. Нейкім сваяком адчуваю нават яе цяперашняга мужа — свае людзі.

Наша агульная дачка (таксама Кася) ставіцца да ўсяго станоўча і разумее, што бацькі ў яе — «нармальныя пацаны». Нам гэта вельмі прыемна.

12 гадоў таму я вынес з хаты тэлевізар. Навошта марнаваць час на прагляд сюжэтаў пра падманы і бойкі? Але ж прыцягвае, як наркотык. У мяне шмат іншых спраў. Часу і так не хапае. Асабліва зараз, калі ідзе праца над чарговым альбомам. Не ведаю, можа ёсць людзі, якія ўключаюць яго раз на год, каб выслухаць навагоднее віншаванне. У мяне ж тэлевізар працаваў у «фонавым» рэжыме, то бок быў уключаны амаль пастаянна і стабільна адцягваў увагу. Словам, ад гэтай халеры я пазбавіўся і ніколькі не шкадую.

Дарэчы, адбылося гэта якраз у той час, калі я перастаў ужываць алкаголь. Як кажуць, выпіў сваю «цыстэрну». Зайшоў даволі далёка. Стаў амаль «прафесіяналам».

Кідаць цалкам не хацелася — толькі для адпачынку арганізму. «Адпачываю» ўжо 16 гадоў.

Пасля разводу з Касяй я ажаніўся зноў. На сваіх песнях.

**Падрыхтаваў**
**Аляксандр Тамковіч**

ЦЭНЗУРА

# СТРЭЛ У КУЛЬТУРУ. ВЫСТАВА «ПАГОНЯ–20»

Аляксей ХАДЫКА

**Знакамітая фраза «Калі я чую слова «культура»… я здымаю з засцерагальніка свой браўнінг!» у 1933 годзе прагучала ў п’есе «Шлагетэр», напісанай будучым прэзідэнтам Палаты пісьменнікаў Рэйха (з 1935) Гансам Йостам. Пазней яе прыпісвалі многім правадырам нацыянал-сацыялістычнай Германіі: Гімлеру, Гебельсу, Гейдрыху, Розенбергу.**


Крамольная інсталяцыя «Беларуская піраміда»

Тое, што адбываецца зараз у беларускай культурнай прасторы, не выклікае асаблівага здзіўлення. Днямі забаранілі канцэрты Зміцера Вайцюшкевіча, «Ляпіса Трубяцкога», «Neuro Dubel» і праграмы «Крамбамбуля» з Лявонам Вольскім. Зараз чарга чыстак дайшла да жывапісу са скульптурай.

Скандалу, што распачаўся з адкрыццём 11 сакавіка ў Палацы мастацтва юбілейнай выставы суполкі «Пагоня», папярэднічалі цікавыя падзеі. 22 лютага кіраўніцтва Саюза мастакоў атрымала ад старшыні Мінгарвыканкама Мікалая Ладуцькі кароткі ліст, у якім саюзу безапеляцыйна прапаноўвалася бязвыплатна перадаць у камунальную ўласнасць асноўную выставачную залу — Палац мастацтваў па Казлова, 3. Як бы для рамонту. Між тым, па словах старшыні Саюза мастакоў Уладзіміра Савіча, толькі ў 2008–2009 гадах саюз уклаў у рамонт будынку 930 мільёнаў рублёў, у лютым атрымаў заключэнне МНС пра яго задавальняючы стан, а дакументы на арэнду зямлі ўзгодненыя аж да 2014 года. Адначасова старшыня і іншыя адказныя асобы з выканкама цягам апошніх 3 гадоў, ігнаруючы рэгулярныя запрашэнні, выставы ў палацы не наведвалі. І мецъ уяўленне пра яго стан папросту не здольныя.


Аляксей Марачкін: аўтограф на памяць

Мастак Уладзімір Тоўсцік выказаў здагадку, што зацікаўленасць выканкама палацам звязаная са скандальнай гісторыяй па продажу Аману ўчастку ў цэнтры горада з размешчаным на ім выставачным комплексам па Янкі Купалы, 27. Пэўныя колы шукаюць аналагічнае памяшканне для камерцыйных выстаў у сталіцы, як кажуць, «на халяву». Цвёрды адказ Уладзіміра Савіча на дзіўнае пасланне гучаў так: уласнасцю Саюза мастакоў можа распараджацца толькі рада арганізацыі.

11 сакавіка зрабілася зразумелым, што гісторыя атрымлівае працяг. У гэты дзень у палацы творчая суполка «Пагоня» адчыніла юбілейную экспазіцыю да свайго 20-годдзя. Мастацкі шлях суполкі пачынаўся з нефармальных сходаў мастакоў — Марачкіна, Маркаўца, Басалыгаў, Купавы, Крукоўскага ў 1960-я гады ў майстэрні Яўгена Куліка, размешчанай «на паддашку» ў будынку на цэнтральным праспекце Мінска насупраць КГБ. Творы аднадумцаў вярталі ў культурную прастору Беларусі вобразы яе гістарычных герояў, паўзабытых за часы савецкай улады пачынальнікаў нацыянальнай літаратуры і адраджэння мяжы XIX і XX.

Многія невыпадковыя постаці з мінулага прыйшлі ў свядомасць сучаснікаў менавіта праз работы заснавальнікаў «Пагоні», паказаныя на выставах, змешчаныя ў падручніках гісторыі і літаратуры, у ілюстрацыях да кніг класікаў беларускага пісьменства. «Пагонеўцы» адчынялі для сябе і краіны творчасць заходнебеларускіх мастакоў міжваеннага перыяду, народнае мастацтва з яго яскравымі фальклорнымі кампанентамі. Канчаткова суполка аформілася ў 1990 годзе ў складзе Саюза мастакоў як аб’яднанне «дзеля абуджэння нацыянальнай самасвядомасці народу, ягонага духоўнага, культурнага і дзяржаўнага адраджэння». Менавіта сябры «Пагоні» Уладзімір Крукоўскі, Яўген Кулік і Леў Талбузін распрацавалі дзяржаўную сімволіку незалежнай Беларусі ў 1991 годзе.

Мінула 20 гадоў, і ў зале юбілейнай экспазіцыі ахоплівае ўражанне, што яе можна цалкам перанесці ў раздзел «Паваеннага мастацтва Беларусі» Нацыянальнага мастацкага музея, абнаўляючы апошні як мінімум на трацііну. Падстава — высокі ўзровень зробленага. На адкрыцці ў палацы не было дзе ўпасці яблыку. У наступныя дні плынь наведвальнікаў не спынілася.

На выставе прадстаўлены працы большасці з 70 мастакоў, што ўваходзяць у суполку. Лепшыя за апошнія два дзесяцігоддзі. Чакалася свята — мастацтва, вясны, беларускай гісторыі: «Пагоня» традыцыйна прымяркоўвае свае паказы да дня Дабравешчання, 25 сакавіка, калі ў 1918 годзе адрадзілася наша дзяржаўнасць. Свята атрымалася са скандалам.

Ужо 17 гадоў разам з рэанімацыяй элементаў спарахнелай савецкай ідэалогіі ў беларускую рэчаіснасць вярнулася і яе спадарожніца — цэнзура культурнага жыцця. Напрыканцы 1990-х суполцы не заўсёды ўдавалася арганізаваць штогадовы вернісаж, а ў 1997 годзе па загадзе тагачаснага міністра культуры Сасноўскага з выставы здымаліся і арыштоўваліся «крамольныя» работы. Але чым ёсць цэнзура ў эпоху сучасных камунікацый? Нонсэнсам! Абноўленае кіраўніцтва Саюза мастакоў у апошнія гады спрыяла «Пагоні», ацэньваючы яе надзвычайны творчы патэнцыял. Таму скандал гэтага года выглядае як сцэна з тэатра абсурду.

Пад негалосным, сарамлівабаязлівым ціскам уладнай наменклатуры з экспазіцыі зніклі 6 прац — тры плакаты Крукоўскага, карціна Мікіты і два творы Марачкіна. Пяць з іх — з-за прысутнасці нацыянальнай сімволікі, карціна Марачкіна «Здані («Пераможцы»)», якую «НЧ» ужо анансаваў, — з-за выяўленага мастаком пагляду на падзеі 19 снежня 2010 года ў Мінску. Па словах яе аўтара, кіраўніка «Пагоні» Алеся Марачкіна, — кіраўніцтву Саюза мастакоў выкруцілі рукі, паставіўшы пытанне: альбо работы здымаюцца, альбо ўзнікаюць праблемы з палацам. Незаконна? Але як дзейнічае ў нас сёння закон, не ведае толькі недасведчаны чалавек. Кіраўнік саюза Уладзімір Савіч каментаваць сітуацыю карэспандэнту «НЧ» катэгарычна адмовіўся.

Скандал, які выглядае дадатковай рэкламай выставы, не скончыўся 11 сакавіка. Праз 4 дні з экспазіцыі на загадзе Мінкульта знікла інсталяцыя Генадзя Драздова і Алеся Марачкіна — папяровая «Беларуская піраміда», на якой кожны мог пакінуць свой запіс. Людзі пісалі пра сённяшняе жыццё. А што такое «ШОС», зараз ведаюць самыя зацюканыя чыноўнікі.

Наўрад ці выставу, якую варта наведваць найперш дзеля яе мастацкай вартасці, зачыняць раней прызначанага тэрміну — 27 сакавіка. «Забароненыя» творы з’явіцца на спецыяльнай экспазіцыі ў сядзібе БНФ 23 сакавіка а 17-ай гадзіне. Як там ні было — пластычнае мастацтва — люстэрка жыцця, адбітак мінулага і погляду будучыню. Аматарам пры слове «культура» цягнуцца да пісталетаў варта памятаць яшчэ адзін афарызм — эпіграф да кнігі Расула Гамзатава «Мой Дагестан»: «Калі ты стрэліш у мінулае з пісталета, будучыня стрэліць у цябе з гарматы». Нацыянал-сацыялістычныя аматары страляніны ў культуру ў гэтым ужо мелі магчымасць пераканацца.

ПРЭМ’ЕРА

# ВЯРТАННЕ «ПАНА МІНІСТРА»

Аляксей ХАДЫКА

**На сцэне Тэатра юнага гледача адбылася прэм’ера аднаўленай пастаноўкі п’есы геніяльнага беларускага драматурга Францішка Аляхновіча «Пан міністр».**

Таго самага Аляхновіча, які на некалькі дзесяцігоддзяў апярэдзіў Аляксандра Салжаніцына. Дакументальная аповесць «У кіпцюрох ГПУ» (1937), якую ён напісаў, вырваўшыся з гэтых кіпцюроў, адразу была перакладзена на 7 моваў і расказала свету пра зверствы сталінскай сістэмы.

«Пан міністр» быў надрукаваны раней — у 1924 годзе, і ўзнік як своеасаблівы памфлет на выбарчую сістэму міжваеннай Польшчы: тады Аляхновіч жыў у Вільні. А напісана п’еса ў 1922-м, адначасова са знакамітымі купалаўскімі «Тутэйшымі». Але яе пасыл застаецца верным для таталітарных і аўтарытарных сістэм усіх часоў і народаў. Гісторыя пра тое, як свінабой Філімон Пупкін вышэй усімі праўдамі і няпраўдамі зрабіцца міністрам. Як абвяшчае афіша: «Міністра культуры! Не… Міністра асветы! Не — лепш міністра фінансаў», — разважае Пупкін. Але для дасягнення мэты яшчэ трэба прыдумаць псеўданім, стварыць сабе адпаведны імідж, трапіць на старонкі газет і «прапіярыцца» як след. На гэтым фоне разгортваюцца і любоўныя інтрыгі, бо Пупкін надта любіць маладзенькіх дзяўчат…» Але ж — знаёмы сюжэт!

За пастаноўку ўзяўся рэжысёр Уладзімір Савіцкі, цяперашні мастацкі кіраўнік Тэатра юнага гледача, які доўгі час працаваў у Купалаўскім тэатры, дзе паставіў такія спектаклі, як «Беларусь у фантастычных апавяданнях», «Балада пра каханне» паводле «Альпійскай балады», «Дзікае паляванне караля Стаха» і «Сны аб Беларусі». Пераўвасобленыя зонгі — а гэта п’еса-фарс музычная — абнавіў Лявон Вольскі, каб надаць ім па задуме рэжысёра сучаснае гучанне. У ролі Пупкіна выступае актор Аляксандр Палазкоў, у дзеі таксама задзейнічаны заслужаны артыст Беларусі Леанід Улашчанка, акторы Мікалай Лявончык, Міхаіл Казлоў, Наталля Гарбаценка, Таццяна Чардынцава, Юлія Смірнова.

Лёс творчай спадчыны, як і самога Аляхновіча, трагічны. Драматурга 3 сакавіка 1944 года ў акупаванай немцамі Вільні забілі двое невядомых — ці то агенты ГПУ, ці то польскія спецслужбы. Ён быў аднолькава не даспадобы як тым, так і іншым. На першай пастаноўцы «Пана міністра» ў Мінску 22 чэрвеня 1943 года ў гарадскім тэатры чэкісты здзейснілі няўдалы замах на гаўляйтара Вільгельма Кубэ: загінулі мірныя людзі.

Вяртаннем «глыбокай і метафізічнай», па вызначэнні Уладзіміра Арлова, спадчыны Аляхновіча на беларускую сцэну ў 1990-я займаўся малады таленавіты рэжысёр Мікола Трухан. І заўчасна сышоў з жыцця пасля пастаноўкі апошняй п’есы Аляхновіча «Круці не круці — трэба памярці».


Фота Настассі Мікейчык

«Пан міністр» ужо ставіўся ў новай Беларусі па-за сталічнай сцэнай — у Маладзечне, Слоніме, Баранавічах. У Мінск спектакль вяртаецца ўпершыню за больш чым паўстагоддзя. Наступныя спектаклі — 23 сакавіка, 6 і 15 красавіка на сцэне Дома літаратара, якую часова арэндуе Тэатр юнага гледача. Спектакль, зразумела, для разумных дарослых людзей. Яшчэ адна яго мэтавая група — беларускі савет міністраў амаль у поўным складзе.

Дамо слова рэжысёру-пастаноўшчыку: «У гэтым творы няма станоўчага персанажа, як у Гогаля. Там ёсць смех, і гэты смех гратэскавы. Адсюль жанр — фарс. Такія персанажы ўзнікаюць на зломе часу, калі ўсё неўладкавана, калі згублены арыенціры і зніжаны планкі. І колькі не распавядай пра гэта, усё адно гісторыя паўтараецца, зноў узнікаюць хвалі пены і бруду, і на іх ізноў паўстае ваяўнічая пасрэднасць, якая пачынае дыктаваць усё і ўсім, загіраючы сваімі трызненнямі і фантазіямі астатніх у вір».

ПРЭМІЯ

# ТРЫНАЦЦАЦЬ ГІСТОРЫЙ, ЗАМКНЁНЫХ НА КЛЮЧЫ

## ВАРАЖБА НА ШОРТ-ЛІСТАХ ЛІТАРАТУРНЫХ ПРЭМІЙ

Алесь ГІНЗБУРГ

**Сакавік — месяц адраджэння. Менавіта на сакавік зазвычай прыпадае абуджэнне жыцця ў культурных асяродках. Вось і сёлета цэлы месяц самыя розныя літаратурныя ініцыятывы актыўна падводзяць вынікі 2010 года.**

### Бедная «Ліза»

17 сакавіка адбылося ўручэнне прэміі «Залаты апостраф». Гэтай узнагародай штогод адзначаюць найлепшых аўтараў, надрукаваных у часопісе «Дзеяслоў». На жаль, акурат у гэты дзень «Новы час» здаваўся ў друк, таму імёнаў лаўрэатаў мы падаць не можам.

Што хочацца адзначыць з нагоды прэміі, дык гэта стылістычную разнастайнасць аўтараў, друкаваных у мінулым годзе ў «Дзеяслове». У рубрыцы «Паэзія», напрыклад, суседзяць правакацыйны гомелец Сяргей Балахонаў з нізкай «Перламутравае порна» і мэтр Генадзь Бураўкін з нізкай «Зорка вечаровая». У кожнага аўтара знойдуцца свае прыхільнікі. Здаецца — каго б ні абрала журы конкурсу, публіка будзе ўсцешана пляскаць у ладкі.




Ды толькі не з нагоды намінацыі «Дэбют» — тут падчас традыцыйнай інтэрнэт-галасаванкі, зладжанай сайтам часопіса, разгарэлася спрэчка пра тое, куды коціцца свет у цэлым і літаратура ў прыватнасці. Абурэнне шэрагу прафесійных філолагаў выклікала тое, што сярод усіх твораў пачаткоўцаў карыстальнікі сеціва аддалі перавагу апавяданню «Ліза» Франака Вячоркі. Хлопец напісаў яго яшчэ падчас службы ў войску і даслаў «на волю». Кпіны з нагоды літаратурнага таленту маладога журналіста і палітыка гучалі яшчэ ў сакавіку мінулага года, калі апавяданне надрукавалі ў «Дзеяслове».

Апавяданне «Ліза» апісвае мілосную гісторыю на фоне выбараў 19 сакавіка 2006 года і паслявыбарных хваляванняў. Паводле



Наталка Харытанюк



Франак Вячорка

задумы твор моцна нагадвае аповесць Барыса Пятровіча «Плошча», якая выйшла асобнай кнігай пазней у тым жа годзе. «Навошта такое друкаваць у часопісе?» — абураліся снобы, чытаючы ў дэбютнай прозе Франака пасажы кшталту: «І што такая пекная дзяўчына робіць у апазіцыі?» «Гэта ў мяне першы раз… — Не хвалюйся, мілая. Даверся мне…». «Я асцярожна запусціў руку пад майткі. Там было мокра і горача». Складалася поўнае ўражанне, што тэкст напісаны для няіснага беларускамоўнага «Плэйбоя»… Дарэчы, многія равеснікі Франака апавяданне ўпадабалі.

Рэдакцыя «Дзеяслова» сцвярджае, што пры выбары лаўрэата інтэрнэт-апытанка будзе толькі дадатковым крытэрам: звычайная з'ява сеціва — несумленнае галасаванне, фальсіфікацыі (так званыя «накруткі»). Апроч таго, паводле закона інтэрнэту, калі ва ўдзельніка віртуальнага конкурсу ёсць блог, і ён дае спасылку на галасаванку са словамі: «Не галасуйце за мяне — прагаласуйце за майго сябра!» — «клікаюць» усё адно на імя таго, хто даваў спасылку. Рэй вядзе крытэр знаёмства: заўжды прыемна падтрымаць «свайго». Феномен вялікай увагі да празаічных спробаў Франака зразумелы: вядомае імя, грамадзянская актыўнасць аўтара, яго яркі лёс ды прыкметная асоба. Да таго ж, робіць сваю справу папсовасць апавядання «Ліза», якая дае пастаўы гаварыць аб «плошчавай» літаратуры як экзатычнай нацыянальнай разнавіднасці літаратуры «бульварнай». Той, хто калі-кольвек каха ў і калі-кольвек быў на Плошчы, прачытае гэты твор як мінімум з цікаўнасці.

Пры гэтым не выключана, што ўзнагарода дастанецца менавіта Франаку. Барыс Пятровіч адгукаецца пра шквал негатыўнай крытыкі такім чынам: «Мне асабіста апавяданне падабаецца. На пошту рэдакцыі прыходзіць дзясяткі твораў маладых аўтараў. «Ліза» была напісаная больш-менш прымальна: стылёва, з граматна пабудаваным сюжэтам. Абсалютна някепска для Франакавага ўзросту. Можа быць, абурэнне чытачоў звязана з тым, што яны не чыталі адсеяных намі твораў. Мне здаецца, што тыя, хто крытыкуе Франака, ставяцца да яго занадта суб'ектыўна. Не ведаю, ці стане ён празаікам, але, мяркуючы па першым апавяданні, яму варта працягваць».

Ці працягне Франак? Так ці інакш, «Ліза» ўжо стала з'явай сучаснай літаратуры.

**Шорт-ліст літаратурнай прэміі «Дэбют»:**

**Паэзія:**

Ірына Бельская. Падборка вершаў «…Бо ранак раніц». «Дзеяслоў», №44.

Ігар Кулікоў. Падборка вершаў «Закон узаемнае невылечнасці». «Дзеяслоў», №47.

Віталь Рыжкоў. Зборнік паэзіі «Дзверы, замкнёныя на ключы». Мінск: Логвінаў, 2010.

**Проза:**

Сяргей Егарэйчанка. «Аповесць пра чалавека, які не хацеў быць Богам». «Літаратурная Беларусь»/ «Новы час», кастрычнік, 2010.

Анка Упала. «Інь-Ян». Іранічныя аповеды. «Дзеяслоў», №47.

Наталка Харытанюк. Трынаццаць гісторый пра мёртвага катА. Мінск: «Логвінаў», 2010.

**Пераклад:**

Антон Францішак Брыль / Дж.Р. Р. Толкін. «Каваль з Вялікага Вутану». Мінск: «Логвінаў», 2010. Пераклад з англійскай.

Наста Лабада / Тувэ Янсан. «Маленькія тролі і вялікая паводка». Мінск: «Зміцер Колас», 2010. Пераклад са шведскай.

Вольга Цвірка / Мікаэль Ніэмі. «Папулярная музыка з Вітулы». Мінск: «Логвінаў», 2010. Пераклад са шведскай.

### Дзевяць дэбютантаў

21 сакавіка, у Сусветны дзень паэзіі, адбудзецца ўручэнне літаратурнай прэміі «Дэбют» імя Максіма Багдановіча, заснаванай Беларускім ПЭН-цэнтрам і Саюзам беларускіх пісьменнікаў. Як сцвярджаюць у ПЭНе і СБП, прэмія адзначыць пераможцаў у трох намінацыях: паэзія, проза, мастацкі пераклад. Да разгляду журы прымаліся дэбютныя кнігі, напісаныя па-беларуску аўтарамі ў веку да 35 гадоў і выдадзеныя цягам 2010 года, а таксама грунтоўныя часопісныя і газетныя публікацыі.

У шорт-лісце — дзевяць шчасліўчыкаў. Але, у адрозненне ад «Залатога апострафу», ён амаль не пакідае інтрыгі што да імёнаў пераможцаў. Абсалютна відавочна, што выдадзеная і выпешчаная кніга — значна істотнейшы козыр, чым часопісная публікацыя — няхай і аб'ёмная. Вось як адгукаецца пра сваё вылучэнне іранічная магілёўская пісьменніца Анка Упала: «Напярэдадні ўручэння прэміі я адчуваю, што не маю шанцаў паўнавартасна пазмагацца за яе, бо абставіны склаліся так, што напісаная кніжка мая так і не выйшла ў 2010 годзе. Таму я не хвалююся. Тым не менш, сам факт намінавання, безумоўна, радасны. Гэта значыць, што тое, што ты робіш, заўважаюць. Ведаць гэта і прыемна, і важна».

Трэба спадзявацца, прэміі кшталту «Дэбюту» стануць штогадовымі, і гэта падштурхне маладых аўтараў да таго, каб актыўней пісаць і выдавацца, а літаратурныя суполкі і мецэнатаў — спрыяць выданню такіх кніжак.

АНОНС

# ЭМІР КУСТУРЫЦА Ў МІНСКУ

Аляксей ХАДЫКА

**29 сакавіка ў мінскім Палацы спорту адбудзецца канцэрт «No Smoking Orchestra» — калектыву знакамітага рэжысёра, акцёра і музыкі з Сербіі Эміра Кустурыцы.**

Гэта вельмі добрая пляцоўка, кажуць знаўцы, прыгадваючы папярэдні прыезд майстра ў Мінск з канцэртам у 2008 годзе ў Палацы рэспублікі. Палац спорту мае значна лепшую акустыку.

Кустурыца зрабіўся ў Мінску рэгулярным госцем: апошні раз ён завітаў на XVII Мінскі міжнародны фестываль «Лістапад–2010», атрымаўшы на ім спецыяльны прыз «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве». А таксама выступіў з майстар-класамі для студэнтаў і выкладчыкаў Акадэміі мастацтваў.

Эксцэнтрычны Кустурыца здзівіў многіх сваімі рэверансамі ў бок кіраўніка беларускай дзяржавы, заявіўшы, што яго ідэалам з'яўляецца «салодкая дыктатура», паколькі ён сам чалавек таталітарны, а таксама лічыць, што пераход ад камунізму і сацыялізму да капіталізму мусіць адбывацца павольна. Як у Беларусі. Тагачасны прылёт Эміра на ўласным самалёце каштаваў беларускім падаткаплацельшчыкам каля 40 тысяч еўра. Магчыма, нашае разуменне салодкага з разуменнем Кустурыцы не зусім супадае.

Але класіка ягоных паэтычных кінаработ, безумоўна, застаецца па-за крытыкай: Кустурыца — лаўрэат кінафестывалю ў Венецыі, двойчы — у Канах, аўтар такіх вядомых фільмаў, як «Час цыганоў», «Чорная котка, белы кот», «Жыццё як цуд», «Арызонская мара», «Андэграўнд», «Марадона».

А ягоная музыка ў «No Smoking Orchestra» — як працяг фільмаў. Неперадавальная сумесь турэцкіх маршаў, цыганскіх мелодый, кантры, паўднёваамерыканскіх матываў, заходніх рэмінісцэнцый. Калі браць нацыянальны кампанент, пра важнасць якога для «невялікіх» дзяржаў Кустурыца заўсёды гаворыць, хаця і падкрэслівае, што ён інтэрнацыяналіст, яго музыка таксама спецыфічная. Сумесь славянскіх, цыганскіх, габрэйскіх мелодый з элементамі джаза, рок-н-рола — у гучанні гітар, акардэонаў, перкусіі. Як кажуць, кожны канцэрт «No Smoking Orchestra» — фільм Кустурыцы «жыўцом».

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 287

Падпісана да друку 18.03.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.